ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!**
**ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ**

**Здавалася б, што можа быць агульнага паміж станам здароўя і выбарам прафесіі? Між іншым, супрацьпаказаннем да прафесіі, пра якую марыць выпускнік, могуць стаць нават скаліёз, плоскаступнёвасць ці, напрыклад, праблемы са зрокам.**

Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
30 МАЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 97 (27462) Кошт 1500 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДЫНАМІЗМ АДНОСІН


Фота БЕЛТА.

**Беларусь, Расія і Казахстан пацвярджаюць імкненне развіваць еўразійскую інтэграцыю. Аб гэтым учора ў Астане на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, дзе таксама прысутнічалі прэзідэнты Украіны і Кыргызстана, заявіў Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Нурсултан Назарбаеў нагадаў, што ў снежні 2012 года бакі дамовіліся правесці ў гэтым годзе тры сустрэчы, каб не збаўляць тэмпы прыняцця дакументаў па далейшай інтэграцыі і стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза. «Сёння наша першая сустрэча на вышэйшым узроўні ў рамках гэтай дамоўленасці. Галоўнае — наша агульнае імкненне інтэгравацца далей», — падкрэсліў Прэзідэнт Казахстана.

«Па-першае, мы зыходзім з таго, што інтэграцыя павінна быць выгадна ўсім яе ўдзельнікам. Дзяржавы ідуць на інтэграцыю, каб атрымаць тое, што яны не могуць атрымаць паасобку. Інтэграцыйны працэс павінен ісці эвалюцыйна, трэба аб'ядноўваць намаганні, шукаць агульныя інтарэсы і рабіць гэта паэтапна», — адзначыў Нурсултан Назарбаеў.

Мытная «тройка» прыняла рашэнне аб прадастаўленні Кыргызстану і Украіне статусу назіральніка ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Адпаведнае рашэнне прынята па выніках пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.

❍❍❍

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка правёў двухбаковую сустрэчу з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Беларускі Прэзідэнт лічыць Казахстан прывабным і перспектыўным партнёрам для Беларусі.

«Двухбаковыя адносіны ў нас развіваюцца даволі дынамічна. І нам удаецца не толькі на нашым узроўні здымаць праблемы і перашкоды на гэтым шляху, але і нашы спецыялісты, урады добра працуюць», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. СТАР 2

## ЦЫТАТА ДНЯ


Фота БЕЛТА.

**Першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід МАРЫНІЧ:**

***«Цэны на асноўную прадукцыю — мяса, малако — у бліжэйшы час павышаць не плануецца. Вы бачыце, як складваецца сітуацыя з малаком і мясам на сусветных рынках з уступленнем Расіі, нашага асноўнага імпарцёра гэтай прадукцыі, у СГА. Таму мы на цяперашнім этапе павышэнне не разглядаем».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 26° |
| Віцебск | + 23° |
| Гомель | + 27° |
| Гродна | + 27° |
| Магілёў | + 23° |
| Мінск | + 23° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.05.2013 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8700,00 |
| Еўра | 11200,00 ▼ |
| Рас. руб. | 276,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 1067,94 ▼ |

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

***31 мая 2013 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца чарговае пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.***

ISSN 1990 - 763X

■ Абітурыент-2013

# МАБІЛЬНІК — ГАЛОЎНЫ «ПРАВАКАТАР» СКАНДАЛАЎ?

## ...або ці можа на ЦТ паўтарыцца расійскі «сцэнарый»

**Першы ў гэтым годзе Адзіны дзяржаўны экзамен (АДЭ) па рускай мове зноў суправаджаўся скандалам. Ноччу, калі маскоўскія школьнікі яшчэ бачылі ружовыя сны, у інтэрнэце з'явіліся першыя фатаграфіі запоўненых экзаменацыйных лістоў — на Далёкім Усходзе ў гэты час выпускнікі і абітурыенты якраз здавалі экзамен.**

**Выявы экзаменацыйных лістоў пачалі імкліва распаўсюджвацца ў сацыяльных сетках. Па просьбе Міністэрства адукацыі і навукі адміністрацыя сацыяльных сетак заблакіравала дзясяткі суполак, якія апублікавалі тэсты з адказамі. Між іншым, па выніках маніторынгу, правільныя адказы ў гэты дзень шукалі 1,5 мільёна карыстальнікаў сацыяльных сетак па ўсёй Расіі.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тым часам, прагледзеўшы інтэрнэт-шпаргалкі, прадстаўнікі Федэральнай службы па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі заявілі, што як мінімум 90 працэнтаў «адказаў» змяшчалі несапраўдную інфармацыю: гэта была або перадрукоўка дэманстрацыйных матэрыялаў або проста нейкія заданні з падручнікаў па падрыхтоўцы.

— Не будзем утойваць — здараюцца спробы сфатаграфаваць экзаменацыйныя матэрыялы на мабільны тэлефон, але ў гэтым выпадку вынікі экзамену ў такіх абітурыентаў анулююцца, — заявіў намеснік міністра адукацыі і навукі Расійскай Федэрацыі Ігар Рымарэнка.

Усяго пры правядзенні АДЭ па рускай мове было зафіксавана каля 30 выкідаў экзаменацыйных матэрыялаў у інтэрнэт у 18 рэгіёнах Расіі. У прыватнасці, стала вядома, што вынікі Адзінага дзяржаўнага экзамену па рускай мове часткова адмяняюцца ў Белагародскай вобласці, дзе была парушана працэдура правядзення АДЭ. СТАР 2

# ЗА ТРЫ ГАДЫ КОЛЬКАСЦЬ АГРАЭКАТУРЫСТАЎ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ Ў 5 РАЗОЎ

**Пра гэта ўчора паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Святлана ШАЎЧЭНКА.**

Паводле інфармацыі спецыяліста, зараз у краіне дзейнічае больш за 1700 аб'ектаў аграэкатурызму. Толькі летась іх паслугамі скарысталіся каля 223 тысяч чалавек. Пераважная большасць кліентаў такіх аграсядзібаў мае айчынную «прапіску», аднак і доля замежных турыстаў зараз складае ўжо каля 30 працэнтаў. Сярод замежнікаў большую частку спажыўцоў беларускага вясковага каларыту складаюць жыхары Расіі, аднак нашай прыродай і ўвогуле беларускасцю пачалі больш цікавіцца турысты з Польшчы, Літвы, Эстоніі, Малдовы і нават ЗША.

Спадарыня Шаўчэнка нагадала, што дзейнасць у сферы аграэкатурызму не з'яўляецца прадпрымальніцкай. Для пачатку гэтай справы ў гаспадара сядзібы павінна быць ва ўласнасці жылое памяшканне ў сельскай мясцовасці, дзе існуюць свабодныя пакоі для размяшчэння турыстаў, асабістая падсобная гаспадарка і наяўнасць розных спецыфічных паслуг.

Атрымаць дазвол займацца паслугамі аграэкатурызму даволі проста. Неабходна падаць адпаведную заяву ў мясцовы Савет дэпутатаў, зарэгістравацца ў падатковай інспекцыі і заплаціць збор у памеры 1 базавай велічыні за год, якая зараз складае 100 тысяч рублёў. Уласнікам такіх сядзібаў не трэба асобна падлічваць свае даходы ад гэтай дзейнасці, трэба проста заплаціць 100 тысяч рублёў — і ўсё.

Больш за тое, на працягу 2 гадоў пасля першай аплаты такога збору новыя аграэкасядзібы правяраць забаронена.

Зразумела, што гаспадары аб'ектаў вясковага турызму плацяць зямельны падатак, аднак і тут існуюць пэўныя льготы. Ад зямельнага падатку вызваляюцца інваліды, ветэраны, пенсіянеры па ўзросце і шматдзетныя сем'і.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДЫНАМІЗМ АДНОСІН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы бачым Казахстан самым прывабным, перспектыўным партнёрам для Беларусі. Таму што тут вельмі шмат работы, якую мы ўмеем рабіць, у якой вы маеце патрэбу, і вы не супраць, каб мы па гэтых напрамках працавалі. Мы гатовы прымаць і прымаем актыўны ўдзел у мадэрнізацыі вашай краіны. У нас нямала праектаў і амаль няма ніякіх праблем у іх рэалізацыі. Гэта сведчыць аб узроўні нашага супрацоўніцтва», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца саміту ў Астане ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы, Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што бакі павінны зрабіць некалькі крокаў у развіцці гэтага перспектыўнага інтэграцыйнага аб'яднання, аб якім не толькі гавораць, але з якім і лічацца. «Вельмі спадзяюся, што мы, маючы практычна падобную пазіцыю з вамі па многіх пытаннях, зможам сёння дасягнуць кансэнсусу», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу прэзідэнт Казахстана падкрэсліў важнасць саміту, на якім у тым ліку плануецца абмеркаваць праблемныя пытанні і шляхі іх вырашэння.

Што датычыцца адносін Казахстана і Беларусі, Нурсултан Назарбаеў адзначыў, што двухбаковы гандаль мае добрую тэндэнцыю росту. Актыўна рэалізуюцца сумесныя праекты, а эканомікі дзвюх краін узаемадапаўняльныя. Нурсултан Назарбаеў таксама запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Казахстан з афіцыйным візітам, каб прадметна абмеркаваць развіццё адносін.

# МАБІЛЬНІК — ГАЛОЎНЫ «ПРАВАКАТАР» СКАНДАЛАЎ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Усе школьнікі, якія правініліся, выкарыстоўвалі мабільныя тэлефоны з выхадам у інтэрнэт. Лёс белагародскіх выпускнікоў цяпер павінна вырашыць Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі. Не выключана, што сёлета яны застануцца ўвогуле без атэстатаў і будуць год чакаць наступнай спробы здачы абавязковага дзяржаўнага экзамену. Таксама будуць пакараны і арганізатары, якія не змаглі папярэдзіць уцечку матэрыялаў у інтэрнэт.

Самае дзіўнае, што зусім нядаўна (літаральна напярэдадні старту экзаменацыйнай кампаніі) Міністэрства адукацыі і навукі РФ аб'явіла аб пошуку выканаўцы дзяржкантракта па выяўленні і ідэнтыфікацыі ў інтэрнэце кантрольна-вымяральных матэрыялаў (КВМ) для адзінага дзяржаўнага экзамену 2013 года. На гэтыя мэты плануецца накіраваць да 5 мільёнаў расійскіх рублёў — адпаведная заяўка размешчана на партале дзяржаўных закупак.

«У 2011—2012 гадах была распрацавана і паспяхова апрабавана сістэма ідэнтыфікацыі кантрольна-вымяральных матэрыялаў, якая дазваляе па выяве ўстанавіць, хто з удзельнікаў экзамену выконваў канкрэтны тэст, у якім пункце правядзення экзамену і хто з'яўляецца арганізатарам экзамену ў канкрэтнай аўдыторыі», — паведамляецца ў дакуменце.

— Прызнаюся, што мы заўсёды з хваляваннем адсочваем падзеі, што адбываюцца ў Расіі падчас правядзення там Адзінага дзяржаўнага экзамену, бо не выключана, што хтосьці стане праводзіць паралелі паміж Адзіным дзяржаўным экзаменам і нашым цэнтралізаваным тэсціраваннем, — расказаў журналісту **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Сёння ў Расіі спрабуюць змагацца з мабільнымі тэлефонамі ў экзаменацыйных аўдыторыях. А на цэнтралізаваным тэсціраванні выяўленне мабільнага тэлефона ў экзаменацыйнай аўдыторыі заўсёды азначала толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі. Прычым для нас не мае значэння: званіў тэлефон ці не, карыстаўся абітурыент сваім мабільнікам падчас экзамену ці проста трымаў яго ў сваёй кішэні. Былі выпадкі, калі мабільны тэлефон званіў пасля таго, як абітурыент здаў сваю тэставую работу, але не паспеў выйсці з аўдыторыі. Усё адно — тэставая работа ў гэтым выпадку анулюецца без права пераздачы тэсціравання ў рэзервовы дзень.

Больш за тое, нават на рэпетыцыйным тэсціраванні мабільныя тэлефоны знаходзяцца ў нас пад забаронай. Вядома, у гэтым выпадку толькі сам абітурыент зацікаўлены ў атрыманні аб'ектыўнага выніку. Таму наўрад ці хтосьці стане выкарыстоўваць мабільны тэлефон для таго, каб атрымаць на «рэпетыцыі» больш высокі бал. Але некаторыя ўдзельнікі рэпетыцыйнага тэсціравання фатаграфуюць экзаменацыйныя тэсты, каб потым выкласці іх змест у інтэрнэт. І гэтая тэндэнцыя нас вельмі трывожыць. Акрамя таго, што ў такой сітуацыі парушаюцца нашы аўтарскія правы, Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў, калі не спыніць такую «самадзейнасць», давядзецца хутка выстаўляць



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

новыя варыянты тэстаў ужо не толькі на кожны з трох раўндаў рэпетыцыйнага тэсціравання, а значна часцей.

Але мы глядзім яшчэ далей: наша задача — не дапусціць нематываваны выкід матэрыялаў ЦТ у сацыяльныя сеткі. Нават калі б такое адбылося, то за час здачы экзамену наўрад ці хтосьці паспее выкласці ў інтэрнэт правільныя адказы, а абітурыенты наўрад ці паспеюць імі скарыстацца, аднак непрыемны асадак пасля гэтага ўсё роўна застаўся б. Між іншым, завяваўшы давер да ЦТ з боку абітурыентаў, іх бацькоў і педагагічнай грамадскасці было вельмі няпроста. Таму мы вельмі даражым створанай намі сістэмай...

**«Некаторыя ўдзельнікі рэпетыцыйнага тэсціравання фатаграфуюць экзаменацыйныя тэсты, каб потым выкласці іх змест у інтэрнэт»**

На думку Мікалая Фяськова, для таго, каб не дапусціць уцечкі зместу тэстаў з экзаменацыйнай аўдыторыі, дастаткова, каб у аўдыторыі прысутнічалі адказныя арганізатары: «Мы патрабуем ад іх няўхільнага захавання нормаў Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, паводле якога праносіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыях, дзе праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне, любыя прадметы, акрамя пашпарта, пропуска і ручкі з чарнілам чорнага колеру, забараняецца. На цэнтралізаваным тэсціраванні пакуль што ніякіх інцыдэнтаў не было, а вось на рэпетыцыйным тэсціраванні не ва ўсіх установах адукацыі арганізатары адказна падыходзілі да сваёй работы».

— Больш за тое, мы пайшлі яшчэ далей і забаранілі мець пры сабе ў экзаменацыйных аўдыторыях мабільныя тэлефоны не толькі абітурыентам, але і педагогам-арганізатарам, якія сочаць падчас выпрабаванняў за парадкам у аўдыторыях. Ім нельга мець з сабой таксама ручкі чорнага колеру, каб ніхто іх ні ў чым нават не западозрыў. І «профіль» падрыхтоўкі педагога не павінен супадаць з профілем экзаменацыйнай дысцыпліны: скажам, філолагі прысутнічаюць на ЦТ па фізіцы, а фізікі — на гісторыі Беларусі.

Безумоўна, невялікая тэрыторыя Беларусі дае арганізатарам цэнтралізавага тэсціравання сур'ёзныя перавагі: у адрозненне ад Расіі з яе некалькімі часавымі паясамі, у нас змест тэставых заданняў становіцца вядомы абітурыентам (а не персаналу пунктаў тэсціравання) толькі ў экзаменацыйнай аўдыторыі ў адзін і той жа час па ўсёй краіне ў дзень іспытаў.

Калі ў еўрапейскіх краінах тыражаваннем матэрыялаў тэсціравання займаюцца або аддзелы лагістыкі, або асобныя службы, то ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў і тыражаваннем, і пакетаваннем матэрыялаў ЦТ займаецца толькі метадыст па гэтым прадмеце. Такім чынам узмацняецца інфармацыйная бяспека. Пад размнажэнне тэставых матэрыялаў у інстытуце адведзены асобныя пакоі з відэаназіраннем, у якіх знаходзяцца рызографы і спецыяльны апарат — лістападборачная машына, які дазваляе ў аўтаматычным рэжыме раскласці размножаныя матэрыялы па дзесяці варыянтах. Для дастаўкі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма распячатаць непрыкметна. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя ад вачэй сімвалы. На кожным пакеце ёсць ярлычок, дзе нанесены нумар і штрых-код, што дазваляе ідэнтыфікаваць пакеты пры іх вяртанні з пунктаў тэсціравання ў інстытут. Бланкі адказаў вырабляюцца на фабрыцы Дзяржзнака, маюць ступені аховы такія, як на грашовых знаках і з'яўляюцца дакументамі строгай справаздачнасці, таму поўнасцю выключаецца магчымасць іх фальсіфікацыі.

На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж арганізатары ЦТ сваім подпісам пацвярджаюць, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі. Наступны этап — дастаўка тэставых матэрыялаў у пункты правядзення ЦТ. Гэтая задача ўскладзена на дзяржаўную фельд'егерскую службу, якой давяраюць дыпламатычную перапіску і дзяржаўныя сакрэты.

— Абавязкова хацелася б звярнуць увагу на яшчэ адну акалічнасць: у Беларусі ажыццяўляецца ведамасны кантроль з боку Міністэрства адукацыі за дзейнасцю і Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў, і ўстаноў, якія забяспечваюць усе этапы арганізацыі, правядзення ўступных іспытаў і залічэння студэнтаў. Акрамя таго, штогод указам Прэзідэнта Беларусі стварaецца Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, — падсумаваў Мікалай Фяськоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Віншуем!

# ПАМЯЦЬ І СУЧАСНАСЦЬ: КРОК ЗА КРОКАМ

**Пісьменнік, даследчык гісторыі айчыннай літаратуры і нацыянальнай культуры, метадыст аддзела міжнароднай і сацыяльна-культурнай дзейнасці Інстытута культуры Беларусі, аглядальнік газеты «СБ. Беларусь сегодня» Адам МАЛЬДЗІС узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Адам Іосіфавіч — даўні аўтар «Звязды», літаратурна-мастацкіх часопісаў «Маладосць», «Полымя», «Нёман», газеты «Літаратура і мастацтва», пісьменнік і даследчык з імем, аўтарытэтны эксперт па самых розных кірунках гісторыі беларускай культуры, беларускага асветніцтва. На працягу некалькіх апошніх гадоў уражлівым плёнам творчай работы вучонага і публіцыста з'яўляюцца яго выступленні на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня», а таксама ў «Голасе Радзімы». Адам Іосіфавіч адкрыў некалькі газетных рубрык і выявіў сябе выключна цікавым апавядальнікам пра нашых знакамітых суайчыннікаў, асобныя гістарычныя мясціны роднай старонкі, пра беларускія скарбы за межамі краіны. Журналісцкая, публіцыстычная дзейнасць Адама Мальдзіса — як вынік яго навуковых, грамадскіх інтарэсаў. Шмат папрацаваўшы ў замежных архівах і бібліятэках, а найперш — у Расіі і Польшчы, вучоны паслядоўна шукаў артэфакты беларускай гісторыі і культуры. За гады плённай работы назбіраўся і ўласны архіў, уласнае веданне многіх крыніц. Мальдзіс — выдатны падказчык, дарадца ў пошуку іншых. Невыпадкова да Адама Іосіфавіча часта ідуць па параду, пачынаючы шлях у навуцы ці краязнаўстве, беларусазнаўстве. Публікацыі даследчыка са старонак «СБ. Беларусь сегодня» і «Голасу Радзімы» (нагадаем: выдаўцом яго з'яўляецца якраз «СБ. Беларусь сегодня») ужо сабраны ў кнігі. Адна з іх — «Беларускія скарбы за мяжою» — пабачыла свет і разышлася літаральна за некалькі месяцаў. Другая — «Суайчыннікі» — падрыхтавана да выдання ў «Выдавецкім доме «Звязда» ў серыі «Беларусь вчера и сегодня».

Супрацоўніцтва Адама Мальдзіса са «Звяздой», літаратурна-мастацкімі часопісамі найбольш выявілася ў арганізацыі публікацый цыкла «Літаратурныя мясціны Беларусі». На працягу некалькіх гадоў часопіс «Маладосць» друкуе артыкулы, прысвечаныя асобным абласцям і раёнам краіны, у звязку з пэўнымі паселішчамі даецца інфармацыя пра пісьменнікаў, якія нарадзіліся там альбо працавалі, пра пісьменнікаў, якія ў розныя гады бывалі ў гэтых мясцінах. Не перабольшваючы, гэты творчы праект можна назваць літаратурна-краязнаўчым падручнікам. І, вядома ж, хацелася б, каб часопісныя публікацыі сталі новай кнігай Адама Мальдзіса і яго калег па збіранні звестак па тэме «Літаратурныя мясціны Беларусі» — Лідзіі Кулажанкі, Дзмітрыя Крывашэя.

Віншуючы Адама Іосіфавіча з высокай узнагародай — ордэнам Францыска Скарыны, ордэнам таго асветніка, да вывучэння жыцця і творчасці якога вучоны таксама спрычыніўся, хацелася б пажадаць даследчыку беларускай культуры, Асветніку з вялікай літары, добрага здароўя, новых творчых здабыткаў! Такія людзі, як Мальдзіс, складаюць асяродак нераўнадушных збіральнікаў памятак зямлі беларускай. Жыццё, праца нястомных вучоных, публіцыстаў, улюбёных у родны край людзей — прыклад — аснова ў развіцці патрыятычных памкненняў моладзі, грамадзян нашай краіны наступных пакаленняў.

**Мікола БЕРЛЕЖ**

14 июня 2013 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. Об изменении размера уставного фонда ОАО «Полесьежилстрой».
3. О внесении и утверждении изменений в Устав общества.
4. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера -- доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 05.06.2013 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200050191

■ Да 70-годдзя аперацыі «Баграціён»

# ЦІ БЫЦЬ МЕМАРЫЯЛУ ПАД СВЕТЛАГОРСКАМ?

**У Светлагорскім гісторыка-краязнаўчым музеі шмат каштоўных экспанатаў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. І ўсё ж экспазіцыя ў гонар двойчы Героя Савецкага Саюза П.І. Батава, камандарма славутай 65-й арміі, асабліва прываблівае. Тут яго партрэт з аўтографам, плашч-накідка, гімнасцёрка, якія нібыта захавалі яшчэ пах франтавога дыму, аўтаручка з падстаўкай, пісьмо, датаванае 1984 годам. У ім Павел Іванавіч дзякуе светлагорцам за званне Ганаровага грамадзяніна гэтага горада. А яшчэ — яго кніга «У баях і паходах», падпісаная жыхарам вёскі Гамза. Але чаму менавіта ім? Своеасаблівы адказ чытаем у падараванай кнізе: «У другой палове дня, калі назіральны пункт нашай арміі ўжо згортваўся, каб перайсці наперад, мяне тэрмінова паклікалі да тэлеграфнага апарата», — успамінае П. І. Батаў. «Асабіста далажыце сапраўднае становішча перад фронтам арміі. Жукаў», — прачытала тэлеграфістка. Адказ: «Корпус Іванова прарваў абарону праціўніка на фронце 8 кіламетраў. Да 12.00 паглыбіліся на 12 кіламетраў. Корпус Панова ўведзены. Паскораны варыянт першага дня наступлення выкананы раней за вызначаны тэрмін». Зноў чытаю на стужцы: «Гэтага не можа быць. У Раманенкі і Гарбатава пройдзена ўсяго 2 км. Далажыце дакладнае размяшчэнне войскаў». Адказ: «Стралковыя дывізіі корпуса Іванова выйшлі на мяжу Гарадзец—Пратасы. Танкавы корпус вядзе бой наперадзе ў раёне Брожа. Пераношу свой камандны пункт у Гамзу». Апарат маўчаў. Нарэшце адстукаў кароткую фразу: «Прыеду глядзець сам».**



**Чэрвень 1944 г. Праз балота па пракладзеных гацях.**

У 15.00 на КП у Гамзу прыехалі Жукаў, Ракасоўскі, Новікаў. Толькі праскочылі іх машыны, як артылерыя праціўніка з Парычаў накрыла ўчастак дарогі...»

Так, камандны пункт арміі ў тыя гістарычныя дні знаходзіўся каля гэтай вёскі. Таму і падпісаў камандарм сваю кнігу яе жыхарам.

Уся Беларуская аперацыя ахоплівала велізарную тэрыторыю — больш за тысячу кіламетраў па фронце ад Заходняй Дзвіны да Прыпяці і да 600 кіламетраў у глыбіню — ад Дняпра да Віслы і Нарава. У ворага 1 мільёнам 200 тысячамі салдат і афіцэраў, ворага, на ўзбраенні — 9,5 тысячы гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1300 баявых самалётаў. Трэба было пераадолець падрыхтаваную абарону глыбінёй да 250-270 кіламетраў. Таму значных падзей у аперацыі «Баграціён» было нямала. І ўсё ж прарыў па пракладзеных на балотах гацях у Парыцкім (цяпер Светлагорскам раёне) меў вырашальнае значэнне. Класічны прыклад палкаводчай і воінскай мудрасці! Аб гэтым пераканаўча гаворыцца і ў кнізе «Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941-1945 г.г. Кароткая гісторыя».

У сваіх «Успамінах і разважаннях» Георгій Жукаў сцвярджае, што камандуючы фронтам, генерал арміі К.К.Ракасоўскі, у адпаведнасці з планам Стаўкі, пасля дакладнай даразведкі прыняў рашэнне прарваць абарону праціўніка двума групіроўкамі: адной — на поўнач ад Рагачова і другой — на поўдзень ад Парычаў. Але фактычна напрамкам галоўнага ўдару стаў менавіта парыцкі. Гаворачы аб ходзе падзей у раёне Рагачова, Жукаў сведчыць:

...«Пры падрыхтоўцы аперацыі была слаба разведана абарона праціўніка на рагачоўска-бабруйскім напрамку, з прычыны чаго дапушчана недаацэнка сілы яго супраціўлення. У выніку гэтай памылкі 3-й і 48-й арміям быў дадзены завышаны ўчастак прарыву супраць паўднёвага ўчастка. Да таго ж арміі не мелі дастатковых сродкаў прарыву. З'яўляючыся прадстаўніком Стаўкі, я своечасова не паправіў камандаванне фронту»...

«...На паўднёва-парыцкім напрамку такіх пралікаў не было. Галоўная цяжкасць заключалася ў тым, што належала дзейнічаць у цяжкапераадольнай лясістай і моцна забалочанай мясцовасці»...

«...Як мы і меркавалі, нямецкае камандаванне менш за ўсё чакала ў гэтым раёне моцнага ўдару нашых войскаў. Таму абарона праціўніка тут, па сутнасці, была ачаговай, суцэльнай абароны не існавала»...

П.І. Батаў у кнізе «У баях за Беларусь» піша:

**Пасля таго як у пачатку чэрвеня на КП арміі ў лес каля вёскі Прасвет нечакана прыбылі маршалы Г.К. Жукаў і К.К. Ракасоўскі і асабіста пераканаліся ў рэальнасці, здавалася б, фантастычных планаў, рашэнне аб напрамку галоўнага ўдару войскаў арміі і фронту было прынята.**

«Праціўнік, знаходзячыся ў беларускіх балотах, быў перакананы, што ўсе заштрыхаваныя ўчасткі мясцовасці на картах — гразкія балоты, непраходныя для войскаў. Выключалася ўсякая магчымасць актыўных дзеянняў нашых войскаў на гэтых участках... Таму пры выбары напрамку галоўнага ўдару нашу ўвагу ўсё больш прыцягвалі балоты і забалочаныя ўчасткі на левым флангу і ў цэнтры апаратыўнага пастраення арміі, дзе размяшчаўся ў абароне 18-ы корпус. Гэтым займаліся ўсе камандныя інстанцыі, штабы, паліторганы задоўга да выезду ў Гомель на Ваенны Савет...»

Пачалося ўзвядзенне танкадрома на балотах. І ўсё ж сумненняў было нямала. Але пасля таго як у пачатку чэрвеня на КП арміі ў лес каля вёскі Прасвет нечакана прыбылі маршалы Г.К. Жукаў і К.К. Ракасоўскі і асабіста пераканаліся ў рэальнасці, здавалася б, фантастычных планаў, рашэнне аб напрамку галоўнага ўдару войскаў арміі і фронту было прынята.

Чытаем далей успаміны П.І. Батава з гэтай жа кнігі: «Вядома, парыцкі напрамак быў для нашай арміі прывабным: участак мясцовасці сухі, не мае водных перашкод. Аднак, думалася, тут нам не дасягнуць высокага тэмпу руху наперад. Пануючыя вышыні — у ворага, шчыльнасць яго агнявых сродкаў вялікая. Наступаць пад Парычамі значыла б несці цяжкія страты».

«...Даныя разведкі пацвердзілі дзве нашых здагадкі: папершае, праціўнік выключаў магчымасць наступлення на гэтым напрамку і меў тут слабую абарону; па-другое, дрыгва праходная для людзей, а калі пракласці гаці — то і для тэхнікі. Так паволі пачалася падрыхтоўка аперацыі, якую пасля прадстаўнік Стаўкі Г. К. Жукаў назваў «інжынернай аперацыяй...»

...«План армейскай аперацыі па дырэктыве Ракасоўскага трэба было прадставіць 8 чэрвеня. У нас да канца мая ўжо амаль уся падрыхтоўка была завершана, і мы маглі прадэманстраваць рэальныя магчымасці абранага варыянту напрамку галоўнага ўдару».

«...Галоўны ўдар намячаўся, як ужо было сказана, праз балоты, дзе абарона праціўніка слабей. Адсюль вынікала магчымасць увесці танкавы корпус і стралковыя дывізіі другіх эшалонаў у першы ж дзень бою. У гэтым і была сутнасць паскоранага варыянту. Як толькі стралковыя часці пераадолеюць галоўную паласу нямецкай абароны, уваходзіць у бой танкавы корпус. Танкісты без вялікіх страт самі прарвуць другую паласу. Праціўнік не мае за балотамі ні буйных рэзерваў, ні магутнага агню...»

К.К. Ракасоўскі высока ацаніў працу армейскага штаба.

Агульнае наступленне павінна было пачацца ў 7 гадзін раніцы 24 чэрвеня.

Падзеі развіваліся так. 1-ы гвардзейскі Данскі танкавы корпус пачаў наступленне, пераадольваючы балота Брыдскі Мох паблізу вёсак Пятровічы і Мартынаўка Парыцкага (зараз Светлагорскага) раёна. Гэтае балота мела ў даўжыню 4, а ў шырыню 2 кіламетры. Побач з ім — Вальскі лес. Там дыслакаваліся 69-я і 37-я стралковыя дывізіі. Камандны пункт 65-й арміі знаходзіўся ў лесе, які падступае да вёскі Прасвет.

23 чэрвеня войскі 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў перайшлі ў наступленне. Войскі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем К.К. Ракасоўскага, якія знаходзіліся тады ў Парыцкім раёне, уступілі ў бой днём пазней. Але значна раней (за 2 месяцы да пачатку аперацыі «Баграціён»), як мы ўжо казалі, тут пракладваліся гаці, ішла падрыхтоўка да строга засакрэчанага наступлення. 22 чэрвеня (за дзень да намечанага наступлення) правялі разведку боем, у выніку якой атрымалася ўдакладніць размяшчэнне сіл праціўніка на пярэднім краі.

У ноч на 24 чэрвеня бамбардзіровачная авіяцыя злучэнняў маршала А.Я. Галаванава падвергла ўдару пярэдні край абароны і асабліва раёны Парычаў, Селішчаў, Гамзы, Сякерыч, Чэрніна. У 7.00 пяхота і танкі пачалі займаць зыходнае становішча ў паласе 18-га корпуса. Дзякуючы рашучым дзеянням 69-й, 37-й гвардзейскай і 15-й Сівашскай дывізій ужо ў першай палове дня стварыліся спрыяльныя ўмовы для ўводу ў прарыў праз балота танкавага корпуса і развіцця поспеху на напрамку галоўнага ўдару. Дывізіі першага эшалона авалодалі моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў: Раковічамі, Мікалаеўкай, Пятровічамі, Сякерычамі Парыцкага раёна. Паспяхова ўступіла ў бой 75-я гвардзейская дывізія, якая, наступаючы на Селішчы, пашырыла прарыў.

**Як ні дзіўна, аднак ніякага мемарыяла ў гонар гістарычнай і класічнай, па канонах ваеннага мастацтва, аперацыі «Баграціён» дагэтуль у Беларусі няма. Ці трэба гаварыць аб тым, што значнасць такога мемарыяла для цяперашніх і будучых пакаленняў бясспрэчная.**

За дзень было знішчана да 1700 варожых салдат і афіцэраў, 19 гармат, 35 мінамётаў, 85 кулямётаў, 17 аўтамашын, разбурана 27 дзотаў і 25 бліндажоў. Да зыходу другога дня войскі паглыбіліся ў абарону немцаў на 30 кіламетраў. А далей — вызваленне Парычаў, Жлобіна, разгром немцаў у «Бабруйскім катле»...

Вось так разгортваліся гэтыя гістарычныя падзеі ў Светлагорскім раёне. Аб гэтым сведчаць таксама і ўспаміны К.К. Ракасоўскага (кнігі «На напрамку галоўнага ўдара», «Салдацкі абавязак»), Г.К. Жукава («Успаміны і разважанні»).

Як ні дзіўна, аднак ніякага мемарыяла ў гонар гістарычнай і класічнай, па канонах ваеннага мастацтва, аперацыі «Баграціён» дагэтуль у Беларусі няма. Хочацца верыць, што на тэрыторыі былога балота Брыдскі Мох калі-небудзь з'явіцца сапраўдны музей, які мог бы стаць цудоўным філіялам Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. На маю думку, добра было б узвесці будынак музея ў выглядзе бліндажа. У ім павінны быць сабраныя ўсе асноўныя матэрыялы планавання, падрыхтоўкі і правядзення аперацыі «Баграціён». Гэта былыя сакрэтныя дакументы, загады, распараджэнні, карты, а таксама дакументальныя фільмы, рэчыўныя экспанаты, дыярамы, макеты, партрэты Жукава, Ракасоўскага, Батава і іншых военачальнікаў, а таксама тых салдат і афіцэраў, што асабліва праславіліся ў баях. Асобныя дыярамы павінны быць прысвечаны пракладцы гацяў і «танкадрома» праз балота, пачатку аперацыі. А шматлікія праблемы напаўнення музейнага будынка экспанатамі самі сабой адпадуць, калі мемарыял сапраўды стане філіялам Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Нядрэнна прадугледзець пешаходныя маршруты па тэрыторыі былога ўрочышча Брыдскі Мох. Пракласці частку гацяў, на якіх усталяваць некалькі танкаў, муляжных постацяў салдат у «макраступах». Там, дзе дыслакаваліся нашы войскі, добра б аднавіць некаторыя бліндажы, зямлянкі, акопы.

Па-чалавечы добра б і ўзвесці капліцу, дзе знаходзілася б памінальная кніга з прозвішчамі воінаў, што загінулі пры правядзенні гэтай аперацыі ў нашых мясцінах. Падчас царкоўных свят тут праходзілі б памінальныя службы, а наведвальнікі мемарыяла змаглі б запаліць свечкі ў памяць аб загінулых героях.

Але перш за ўсё сапёрам трэба дбайна абследаваць тэрыторыю будучага мемарыяла. Гэта не толькі засцеражэ яго, але, магчыма, і папоўніць музей некаторымі экспанатамі і звесткамі.

Яшчэ працуючы губернатарам Гомельскай вобласці, А.С. Якабсон горача падтрымліваў ідэю стварэння мемарыяла ў гонар аперацыі «Баграціён» на тэрыторыі Светлагорскага раёна. Была створана рабочая група на чале з былым намеснікам старшыні аблвыканкама П.А. Кірычэнкам, члены якой неаднаразова бывалі ў раёне гістарычных падзей і вызначылі паблізу аўтамабільнай трасы Бабруйск—Мазыр каля вёскі Прытыка месца магчымага ўзвядзення мемарыяла. Дарэчы, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Р.А. Рапота публічна падтрымаў гэтую ідэю. Выказаў сваю падтрымку і міністр абароны Беларусі, генерал-лейтэнант Ю.В. Жадобін: «Міністэрства абароны падтрымлівае ідэю стварэння мемарыяла як форму ўвекавечвання памяці абаронцаў Айчыны ў рамках Саюзнай дзяржавы. Адпаведнае пісьмо міністру культуры Рэспублікі Беларусь накіравана».

Ці трэба гаварыць аб тым, што значнасць такога мемарыяла для цяперашніх і будучых пакаленняў бясспрэчная. Яго ўзвядзенне стане выкананнем нашага маральнага абавязку перад тымі, хто варты ўдзячнага захаплення і вечнай памяці. Вось толькі калі распачнецца гэтая справа?

**Ізяслаў КАТЛЯРОЎ**

■

■ Жыццялюбы

# У КОЖНЫМ З НАС ЖЫВЕ СОНЦА!

## ЛІЧЫЦЬ СТВАРАЛЬНІК ПЕРШАГА Ў СВЕЦЕ МУЗЕЯ СОНЦА ВАЛЕРЫЙ ЛІПЯНКОЎ

**Калі Валерый Іванавіч пачуў, што ў музей завітала журналістка з беларускай газеты «Звязда» — сонечная ўсмешка асвяціла яго твар. Маўляў, свае людзі! «Звязда» — гэта ж таксама Сонца!» І першай справай павёў да саламяных экспанатаў, якія ў Новасібірск прывезлі яго сябры з Беларусі. «Дзівіцеся, заглянула і беларускае сонца ў наша аконца!»**

### КОЛЬКІ ЛЮДЗЕЙ — СТОЛЬКІ СОНЦАЎ

Азіраюся — і не веру сваім вачам! Са сцен на мяне пазіраюць — усміхаюцца, падміргваюць, паказваюць язык — мноства самых розных сонцаў. У новасібірскім музеі — больш за дзве тысячы выяў гэтай загадкавай зоркі. Ёсць сонейкі з Англіі, Непала, Італіі, Мексікі, ЗША, Індыі, Германіі, Тыбета... Вышытыя, маляваныя, керамічныя, каваныя, плеценыя... Недарэмна кажуць: колькі людзей — столькі сонцаў. Большасць жа з іх створана «залатымі» рукамі разьбяра па дрэве Валерыя Ліпянкова.

— Усё, што вы тут убачыце, прысвечана Сонцу, — перахоплівае мой погляд сонечных спраў майстар. — Сонца ў народнай традыцыі, сонечныя багі старажытных цывілізацый, сонечныя сімвалы ў наскальных малюнках старажытных народаў Еўропы, Азіі, Амерыкі... Сувенірная прадукцыя з сонечнай сімволікай... Мы збіраем вершы, гімны, легенды, навуковыя публікацыі, звязаныя з Сонцам...



Нязменны кіраўнік новасібірскага музея Сонца Валерый ЛІПЯНКОЎ.

**Незвычайныя музеі Расіі**

***Музей агародных чучал*** (Южа Іванаўскай вобласці), ***Музей жахаў*** (Цвер), ***Музей гарэлкі*** (Мышкін, Угліч, Шацк, Нікалаеўка), ***Музей камп'ютарных мышак і дыванкоў*** (Белгарад), ***Музей забабонаў*** (Угліч), ***Музей астмы*** (Екацярынбург), ***Музей беспрацоўя*** (Чалябінск), ***Музей шпаргалак*** (Кіраў), ***Музей грошай*** (Яраслаўль, Семілукі), ***Музей цэглы, Музей працоўнага інструменту, Музей сноў, Музей вады, Музей вяселля*** (Санкт-Пецярбург), ***Музей дарэвалюцыйнага пafетра*** (Падмаскоўе), ***Музей варварства*** (Уладзівасток), ***Музей унітазаў, Музей прадпрымальніцтва, Музей казак, Музей жанчыны, Музей аўтаўгонаў імя Юрыя Дзетачкіна, Музей літары «Ё»*** — Масква, ***музей «Падпольная тыпаграфія»*** (Масква).

> **«У апошнія гады навукоўцы толькі рукамі разводзяць: за ўвесь час назіранняў яны не сустракалі такой сонечнай актыўнасці. А мы яшчэ дзівімся, што катаклізмаў на планеце стала больш...»**

Салярныя знакі ўсюды суправаджалі нашых продкаў — старажытных славян. Сонца выразалі над вокнамі, на аканіцах, на калаўротах, аздаблялі ім вопратку, даспехі воінаў... Асабліва шмат было сонечных знакаў-абярэгаў у старажытнаславянскай пісанцы.

— Распісанае яйка, якое дорацць цяпер на Уваскрэсенне Хрыстова, мае ў аснове сонечную сімволіку, — працягвае Валерый Іванавіч. — Гэта невыпадкова, паколькі Хрыста таксама называюць Сонцам — Сонцам праўды, Сонцам Ісціны. Раство Хрыстова людзі святкуюць 25 снежня. У гэты ж час, пасля зімовага сонцастаяння, дзень пачынае прыбываць — і старажытны язычніцкі свет святкаваў нараджэнне Сонца.

Не толькі славяне пакланяліся сонцу. У музеі прадстаўлены сонечныя багі розных народаў, краін, эпох. Самая старажытная выява — акамянелая ракавіна, названая ў гонар сонечнага бога Егіпта — Амона Ра. Яна знойдзена на беразе Паўночнага Ледавітага акіяна, ёй 300 млн гадоў.

Вялікую гістарычную каштоўнасць мае і выява японскай сонечнай багіні Аматэрасу, якую ў Японіі да гэтага часу шануюць як заснавальніцу імператарскай дынастыі. Яе твар не прынята было маляваць, таму ў імператарскім палацы захоўваўся кулёк з рысавай паперы з надпісам — «Аматэрасу — «Зззяючая на небе». Турысты з краіны Узыходзячага Сонца прызнаваліся, што такога старажытнага малюнка багіні не бачылі нават на радзіме.



Такой старажытнай выявы сонечнай багіні Аматэрасу японскія турысты не бачылі нават на радзіме.

— Салярныя знакі, звярніце ўвагу, ва ўсіх народаў розныя, з «этнічным ухілам», — кажа Валерый Ліпянкоў. — Так, напрыклад, на Поўначы Сонца ўвасабляў алень, які нёс яго на сваіх рагах. Аднойчы алень некуды схаваў Сонца. Стала цёмна, холадна, усё замяло снегам. І тады людзі адправілі лепшага паляўнічага, каб ён дагнаў жывёлу і вярнуў сонца на неба. Гэтая легенда, як вы пэўна здагадаліся, аб Палярнай ночы.

У кітайцаў жа Сонца сімвалізуе крумкач. Ды не адзін, а цэлых 365. Усе яны сядзяць на святым дрэве, і кожную раніцу новы крумкач узнімаецца ў неба. Новы крумкач — новае Сонца.

— Тое, што на небасхіле ўвесь час з'яўляецца «іншае Сонца», ведалі не толькі кітайцы, — Валерый Іванавіч пераходзіць на шэпт, быццам бы выдае вялікую тайну. — Кожны дзень энергія Сонца змяняецца. Пра гэта ёсць згадкі і ў ацтэкаў, і ў іншых цывілізацый. Таму што ўся наша Сонечная сістэма з велізарнай хуткасцю ляціць у касмічнай прасторы, пастаянна перасякае наймагутнейшыя гравітацыйныя і электрамагнітныя палі. Мы гэтага проста не заўважаем. Але калі ўвесь час мяняецца Сонца, то мяняецца і наша планета. У апошнія гады навукоўцы толькі рукамі разводзяць: за ўвесь час назіранняў яны не сустракалі такой сонечнай актыўнасці. Сонца ўжо іншае. Гэта Сонца новай эпохі. А мы яшчэ дзівімся, што катаклізмаў на планеце стала больш...

Пра сонца, думаю, у мяне атрымалася гэта перадаць, Валерый Ліпянкоў, можа расказваць бясконца...

### НЕ ТОЛЬКІ СВЕЦІЦЬ, АЛЕ І ЛЕЧЫЦЬ...

Дарэчы, сонца ў музеі можна не толькі ўбачыць, але і пачуць!.. І нават самому ўзнавіць сонечныя гукі з дапамогай біла — старажытнарускага музычнага інструмента, правобраза званоў. Пры чым тут сонца? — спытаеце вы.

— Ды пры тым, што звон, як і сонечнае святло, закліканы разганяць цемру і ўсякую нечысць, — адказвае Валерый Ліпянкоў. — Па чысціні гуку і пявучасці біла не саступае званам, але па моцы параўнацца з імі ўсё ж не можа. Навукоўцы падлічылі, што ў дарэвалюцыйнай Расіі падчас праваслаўных свят патэнцыял выпраменьвання ўсіх званоў ва ультрагукавым дыяпазоне быў так вялікі, што мог адхіліць траекторыю палёту ракеты сярэдняй далёкасці. Звонам нашы продкі ратаваліся ад чумы і іншых «сусветных пошасцяў».

Лічыцца, што і біла валодае гаючым дзеяннем: забівае хваробатворныя мікробы. У гэтым я пераканалася на ўласным вопыце. Валерый Іванавіч ударыў адмысловымі палачкамі па медных пласцінах, падвешаных на драўлянай перакладзіне — і музей напоўніўся звонам дзіўнай прыгажосці. 10 хвілін падобнай білатэрапіі — і галаўны боль як рукой зняло!

**Даведка «Звязды»**

Свой музей Сонца ў 2009 годзе з'явіўся і ў Рызе.

У музеі Сонца, сапраўды, адчуваеш сябе лёгка і свабодна. Сонечна, адным словам. Не дзіўна, што адна пажылая жанчына з Англіі спецыяльна прыляцела сюды адзначаць сваё шасцідзесяцігоддзе. Ахвотна прыходзяць у музей і з бліжэйшага радзільнага дома цяжарныя жанчыны.

— Прыходзяць, каб пахадзіць па залах, паслухаць «музыку Сонца», проста застацца сам-насам са сваімі думкамі... Часам я ім даю алоўкі, каб яны намалявалі сваё дзіця... А з якім задавальненнем сонейка малююць дзеці! — з замілаваннем адзначае Валерый Іванавіч і запрашае ў пакой, сцены якога завешаны дзіцячымі сонечнымі малюнкамі. — Вы, пэўна, заўважалі, што, калі дзіця ў першы раз бярэ ў рукі аловак, то адразу малюе круг і праменьчыкі. Дзеці на падсвядомым узроўні адчуваюць сваю сувязь з Сонцам. Разумеюць, што праз яго яны маюць жыццё!..



Актывіст новасібірскага Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра Мікалай СЕМАКОЎ, які суправаджаў мяне ў музей Сонца, на фоне сонейкаў з Беларусі.

Чула, што «сонечная атмасфера», якая пануе ў музеі, спрыяе даўгалеццю. І, гледзячы на Валерыя Іванавіча, цяжка ў гэта не паверыць. Стваральніку новасібірскага музея Сонца, як высветлілася, больш за 70 гадоў! А не скажаш!..

Усё жыццё яму казалі: «У цябе ж залатыя рукі. Здавай сваю разьбу ў краму — гора ведаць не будзеш!» А ён і так гора не ведае. Страчвае сваю невялікую пенсію на музей і шчаслівы!..

### НЯХАЙ ДА НАС У СІБІР ЛЕПШ ВЯЗУЦЬ СОНЕЙКІ, ЧЫМ ЧАРЦЕЙ

Вельмі часта тое, што чалавеку здаецца выпадковым захапленнем, раптам перарастае ў справу ўсяго жыцця. Так здарылася і з Валерыем Ліпянковым. Захапляцца разьбой па дрэве ён стаў, працуючы лабарантам у Інстытуце ядзернай фізікі. Неяк зімой на дзяжурстве ўзяў чыстую дошку і задумаўся. Падышла калега і сказала: «Не ведаеш, што выразаць, — выраж сонейка». З гэтага першага сонейка ўсё і пачалося. Потым ён зрабіў «Сонечны цыкл» з 14 сонцаў. І пайшло-паехала...

— Я, калі даведаўся, што ў Каўнасе ёсць музей чарцей, куды з усяго свету звозяць усякую чарцяціну, падумаў: «А няхай у Сібір вязуць сонейкі — можа, у нас цяплей стане (*смяецца*)». Так і з'явілася ідэя стварэння музея Сонца.

Спачатку музей знаходзіўся ў падвале аднаго з жылых дамоў на вуліцы Іванова. Адметна, што гэта вуліца раней называлася Сонечнагорская. Паводле слоў Валерыя Іванавіча, у той падвал нават ніводнага сонечнага праменьчыка не трапляла. Цьмяная лямпачка пад столлю — і ўсё. Пасля, дзякуючы былому кіраўніцтву Акадэмгарадка музей пераехаў на вуліцу Іванова, 11А, у памяшканне былога дзіцячага садка.



Танацiу — бог Сонца ў міфалогіі ацтэкаў.

— Сёлета музею спаўняецца 20 гадоў! — кажа Валерый Ліпянкоў. — Крыўдна (уздыхае), чарцям адвялі ажно трыхпаверхі. А ў нас, на жаль, праблемы з будынкам...

> **«Калі даведаўся, што ў Каўнасе ёсць музей чарцей, куды з усяго свету звозяць усякую чарцяціну, падумаў: «А няхай у Сібір вязуць сонейкі — можа, у нас цяплей стане».**

Хочуць забраць нават той, што ёсць...

Але, нягледзячы на далёка не сонечныя перспектывы, Ліпянкоў працягвае дзень за днём займацца любімай справай — выразаць сонейкі. Бо 2000 экспанатаў — гэта толькі кропля ў моры!

— Нядаўна мне паказалі кнігу са шматтомнага выдання «Энергія Сонца». Там адны выявы Сонца. Уяўляеце — трыццаць вялізных тамоў з выявамі Сонца?! Усё ў нашым свеце круціцца вакол Сонца. І не варта пра гэта забываць. Мая задача — прыцягнуць увагу людзей да таго адзінага знака, які іх можа аб'ядналь. Калі зараз сучасныя рэлігіі раз'ядноўваюць людзей, то Сонца павінна іх аб'яднаць. Праз Сонца мы зможам зліцца ў адну нацыю. І тут спрэчак не будзе, чыё сонца лепш. Аб новым чалавецтве казаў і Цыялкоўскі. Ён пісаў пра сонечных людзей, якія выпраменьваюць святло. Не ад рэлігіі залежыць святасць, а ад таго, адкрыта ў чалавека сэрца ці закрыта. Проста трэба быць больш добрымі, з душой ставіцца адно да аднаго. Сакрат меў рацыю, калі казаў: «У кожным чалавеку — СОНЦА. Толькі дайце яму свяціць».

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**
*Мінск—Новасібірск—Мінск.*

**«Звязда» склала топ-10 незвычайных музеяў свету**

***Музей бананаў*** — Каліфорнія (ЗША)
***Музей валасоў*** — Індэпендэнс (ЗША)
***Музей фаласаў*** — Хусавік (Ісландыя)
***Музей смерці*** — Галівуд (ЗША)
***Музей няшчаснага кахання*** — Загрэп (Харватыя)
***Музей падгарэўшай ежы*** — Каліфорнія (ЗША)
***Музей чалавечага цела*** — Лэйдлен (Нідэрланды)
***Музей каноплі*** — Амстэрдам (Галандыя)
***Музей пахаў*** — Мюнхен (Германія)
***Музей знешняга доўгу краіны*** — Буэнас-Айрэс (Аргенціна)

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!
ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ — У ГЭТЫМ НУМАРЫ!

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

30 МАЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15721)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Юлія БЫКАВА:

## «УСЁ, ШТО ЗРОБЛЕНА З ДУШОЙ, — МАСТАЦТВА»

**Спалучэнне таленту і сціпласці ва ўмовах сучаснага шоу-бізнесу — з'ява не частая. Аднак гурт «Аўра» з ліку тых артыстаў, якія супраць гучных размоў пра свае поспехі, бо выніке гавораць больш за словы. Так, напрыклад, нядаўна іх кліп на песню «Чуеш мяне» трапіў у ратацыю міжнароднага музычнага інтэрнэт-канала, што стала прыемнай навіной як для саміх артыстаў, так і для прыхільнікаў гурта. Юлія Быкава і Яўген Алейнік — тандэм не толькі прафесійны, а яшчэ і сямейны. Два лідары, якіх аб'яднала каханне і любоў да музыкі. На іх рахунку ўжо не адзін дзясятак музычных хітоў... Пра тое, ці існуе музыка без камерцыі, запатрабаванасць — без ажыятажу, чым абумоўлены попыт на беларускамоўныя песні, мы размаўляем з салісткай гурта Юліяй Быкавай.**

**— Як успрынялі навіну, што ваш кліп узялі ў ратацыю канала ELLO?**

— Была вельмі рада, што беларускамоўны кліп «прабіўся». Муж дазнаўся пра навіну, калі мы з сынам ужо заснулі, і, шчаслівы, адправіў мне СМС-паведамленне, якое я ўбачыла толькі раніцай. Для мяне гэта важна, але эмоцый было менш, чым у Жэні. Мы кліп адпраўлялі на канал некалькі месяцаў таму. Адказу не атрымалі і супакоіліся: маўляў, калі не хочуць, то і не трэба. А аказалася — узялі! Праўда, каментарыі розныя былі: ад гнеўных водгукаў да станоўчых. Я ўспрымаю іх спакойна, бо розныя ж людзі бываюць. Не падабаецца толькі, калі нехта пачынае вучыць, як музыку пісаць ці як правільна па-беларуску размаўляць... Для мяне мае значэнне меркаванне толькі тых людзей, якія самі дасягнулі нечага і ў якіх ёсць чаму павучыцца.

**— Як праяўлялася ваша цяга да спеваў у дзяцінстве?**

— Спявала з двух гадоў. Музыку вельмі любіла, а паколькі ў той час яшчэ не было магчымасці запісваць музыку, то я, каб запомніць песню, якую чула па радыё ці тэлевізары, спявала яе перад сном. Была сама сабе «магнітафон».

**— Мара стаць спявачкай збылася?**

— Не, я ў тыя часы наогул ні пра што не марыла. Мяне цікавіла толькі тое, што адбывалася «тут і зараз», а планы на будучыню не будавала. Проста любіла музыку і хацела займацца ёю. Мне наогул не зразумелы падыход — стаць кім заўгодна, толькі б праславіцца. Нават зараз пытанне папулярнасці мяне не хвалюе. Артыст павінен падтрымліваць інтарэс да сябе якасным напісаннем і выкананнем песень. Калі некаму падабаецца зробленае мною, добра. Аднак я не кіну займацца музыкай толькі па прычыне, што яна нікому не патрэбна.

**(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)**

*Медагляд*

## ЯК ВЫБРАЦЬ ПРАФЕСІЮ І НЕ ПАДАРВАЦЬ ЗДАРОЎЕ?

**Здавалася б, што можа быць агульнага паміж станам здароўя і выбарам прафесіі? Зразумела, калі падлетак марыць стаць лётчыкам, ваенным або, скажам, выратавальнікам, там здароўе і фізічныя характарыстыкі выходзяць ці не на першы план. І зусім іншая справа, калі выпускнік плануе працаваць праграмістам, бібліятэкарам, мытнікам ці вывучаць юрыспрудэнцыю. Падлеткам даволі цяжка зразумець, прычым тут здароўе? Між іншым, супрацьпаказаннем да прафесіі, пра якую марыць выпускнік, могуць стаць нават скаліёз, плоскаступнёвасць ці, напрыклад, праблемы са зрокам.**

### НЕ ЖАРТУЙ СА СКАЛІЁЗАМ...

— Пэўныя патрабаванні да стану здароўя прад'яўляе абсалютна любая прафесія. Гэта могуць быць патрабаванні да стану апорна-рухальнага апарату, да зрокавага аналізатара, да вестыбулярнага апарату і гэтак далей. Пры паступленні, скажам, у Ваенную акадэмію ці Інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях здароўе ў абітурыента павінна быць амаль ідэальным! Для рабочых прафесій пералік медыцынскіх супрацьпаказанняў таксама дастаткова шырокі: ваджэнне транспарту, работа на вышыні; работа, звязаная з вежавымі, гусенічнымі, аўтамабільнымі і іншымі кранамі; работа на будоўлі прад'яўляюць у працэсе працоўнай дзейнасці даволі жорсткія патрабаванні да стану здароўя работнікаў, — расказвае **кандыдат біялагічных навук, спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прафесійнай арыентацыі моладзі Алена ШУЛЬГА.** — Многія, напрыклад, не надаюць сур'ёзнай увагі такому захворванню, як скаліёз. Захворванне і сапраўды быццам бы і не такое грознае, прычым яно даволі распаўсюджанае ў прадстаўнікоў падрастаючага пакалення. Але асаблівасцю юнацкіх скаліёзаў з'яўляецца іх схільнасць да прагрэсавання, у выніку чаго можа наступіць спачатку невялікая, а затым і больш выяўленая дэфармацыя рэбраў у выглядзе рэбернага гарба. Падлеткі, у якіх пасля завяршэння росту скаліёз не перавысіў II ступень цяжару, з'яўляюцца практычна здаровымі людзьмі. Аднак і ім не рэкамендуюцца прафесіі, звязаныя з цяжкай фізічнай працай, з частымі нахіламі тулава. А пры рэзка выяўленай дэфармацыі пазваночніка (скаліёз III-IV ступені), якая суправаджаецца парушэннем функцыі органаў дыхання і кровазвароту, прафесійная прыдатнасць падлеткаў будзе ў значнай ступені абмежавана. Ім супрацьпаказаны значнае фізічнае напружанне, пад'ём і спуск па лесвіцы, працяглае фіксаванае становішча цела з адсутнасцю магчымасці яго перамены для зняцця напружання мышцаў спіны і працяглае знаходжанне на нагах.

### ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПШ

**— Прабачце, але як падлетку даведацца, што перашкодай для здзяйснення яго прафесійнай мары можа стаць нават банальны гастрыт? Наколькі я разумею, зрабіць гэта можна толькі падчас атрымання медыцынскай даведкі, якую абітурыент павінен прад'явіць у прыёмную камісію? Але ж у тэрміновым парадку шукаць сабе новую прафесію, мякка кажучы, не вельмі правільна...**

— Адна з галоўных памылак заключаецца ў тым, што спачатку абітурыенты выбіраюць прафесію, а ўжо затым сутыкаюцца з сітуацыяй, калі ўрач, які робіць заключэнне аб прафесійнай прыдатнасці, ставіць іх перад фактам: работа ў той ці іншай сферы або ўвогуле маладому чалавеку супрацьпаказана, або яна можа справакаваць далейшае пагаршэнне яго здароўя. Таму ўрачэбная прафесійная кансультацыя павінна праводзіцца за год ці два да заканчэння школы, каб за той час, што застаўся, падлетак свядома падрыхтаваў сябе да таго, што некаторыя прафесіі яму не падыходзяць і яму трэба пераарыентавацца на іншыя віды дзейнасці. Чым раней гэта будзе зроблена, тым лягчэй у псіхалагічным плане будзе праходзіць працэс пераарыентацыі, тым больш магчымасцяў будзе ў падлетка падрыхтавацца да правільнага выбару прафесіі з улікам адхіленняў у яго стане здароўя.

Увогуле праблема вызначэння прафесійнай прыдатнасці падлеткаў патрабуе аб'яднання намаганняў спецыялістаў самых розных профіляў — псіхолагаў, педагогаў, урачоў, фізіёлагаў. У Рэспубліканскім цэнтры прафесійнай арыентацыі моладзі мы таксама займаемся кансультаваннем падлеткаў: падбіраем ім прафесіі і спецыяльнасці з улікам іх цяперашняга стану здароўя, а таксама з улікам таго, ці падлягае іх захворванне карэкцыі, знаёмім падлеткаў і іх бацькоў з супрацьпаказаннямі вытворчага асяроддзя і працоўнага працэсу.

**(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)**

*Студэнцкае шчасце*

## «КАНСКІЯ ЛЬВЫ» Ў ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНТА

**Ці можа беларускі студэнт за свае здольнасці атрымаць 3 тысячы фунтаў стэрлінгаў? Чацвёртакурснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Мікіта Шумакоў адказвае: «Так!» Карэспандэнт «Чырвонкі» сустрэўся з «узорным вучнем», каб даведацца, што такое студэнцкае шчасце і як да яго прыйсці.**



Мікіта Шумакоў атрымлівае сертыфікат ад пасла Вялікабрытаніі.

**— Мікіта, ты вучышся па спецыяльнасці «Электронны маркетынг». Раскажы, чым вы займаецеся і як маркетынг звязаны з інфарматыкай і радыёэлектронікай?**

— Насамрэч, гісторыя майго паступлення даволі незвычайная для «ўзорнага» студэнта. У ліпені я доўга думаў, куды ўсё ж-такі аддаць дакументы. Прычым далёка не таму, што праходзіў у любую ВНУ. Балаў у мяне было малавата. Выбіраў з некалькіх спецыяльнасцяў, звязаных з маркетынгам, у розных універсітэтах. І раптам натрапіў у зборніку на спецыяльнасць «Электронны маркетынг» у БДУІРы (праўда, у той час яна называлася па-іншаму). Яшчэ трохі падумаўшы, аддаў дакументы сюды і з цяжкасцю, але паступіў.

Ужо потым зразумеў, што зрабіў, напэўна, самы трапны для сябе выбар. Мы вывучаем дысцыпліны двух кірункаў. Адзін звязаны з маркетынгам — навукай прадаваць. Гэтыя дысцыпліны бліжэйшыя да эканамічных ВНУ. А другі — чыста БДУІРаўскі — тэхналагічны. Вучымся праграмаванню на самых распаўсюджаных камп'ютарных мовах, «збіраем» сайты і гэтак далей.

**(Заканчэнне на 6-й стар. «ЧЗ».)**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 05 2013 г.

*Будзе свята выпускное!*

# ШТО ПАСУЕ КАРАЛЮ І КАРАЛЕВЕ БАЛЮ,
## альбо Выбіраем святочны строй



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**На школьным выпускным хочацца выглядаць годна і вылучацца на фоне іншых. Таму ўбор, абутак, макіяж, манікюр і аксесуары павінны падбірацца старанна і не ў апошні момант. Сапраўды, для кожнага выпускніка, незалежна ад таго, хлопец гэта ці дзяўчына, выпускны з'яўляецца вельмі важным мерапрыемствам. На якім жа ўборы спыніцца і да якіх выдаткаў варта быць гатовым?**

**«Сапраўдная элегантнасць заключаецца ў тым, каб апранацца як усе, але на непаўторны манер», — казала французская пісьменніца Францаза Жыро — знакавая постаць у галіне моды і музыкі. Таксама і на выпускным балі кожная дзяўчына жадае спалучыць у сваім вобразе шык, элегантнасць, непаўторнасць, індывідуальнасць, жаноцкасць і нават экстравагантнасць, а хлопцы — авантурызм, дзёрзкасць, стыль і сапраўдны мужчынскі густ.**

### ШЫФОН АЛЬБО ГІПЮР?

Аналізуючы апошнія тэндэнцыі і прагнозы, можна ўпэўнена сказаць; што сярод дзявочых выпускных убораў галоўным трэндам 2013 года стануць кактэйльныя сукенкі: яны асабліва падыдуць вытанчаным і мініяцюрным лэдзі. Кактэйльныя сукенкі не патрабуюць дадатковага дэкору — досыць будзе дарагой тканіны і правільна падабраных аксесуараў. Калі казаць пра матэрыял, то ў моду «ўрываюцца» шыфон і шоўк — яны надаюць убору асаблівую лёгкасць. Нельга забываць і пра гіпюр — гэтая тканіна надае дзяўчыне асаблівую элегантнасць, але памятайце, што яна вельмі «цяжкая» на выгляд, таму трэба правільна скампанаваць яе з іншым матэрыялам, каб не сапсаваць святочны «настрой» сукенкі.

Сімпатычна выглядаюць і доўгія сукенкі, прычым вельмі доўгія. Строі ў грэчаскім стылі даўжынёю да падлогі выдатна падкрэсляць вашу фігуру і добры густ. У такім адзенні любая дзяўчына будзе выглядаць шыкоўна. Вяртаецца мода на пышныя сукенкі, асабліва з шырокім поясам ці гарсэтам, а таксама стыль шасцідзясятых: чорна-бела-чырвоная гама, кароткія сукенкі «цюльпан» і максімальная прастата ўбору. Не пашкодзіць ведаць, што сукенкі ў яркіх тонах не заўсёды выглядаюць вытанчанымі, а вось, напрыклад, персікавы колер, наадварот, зробіць вас далікатнай.

З абуткам трохі прасцей. У модзе застаюцца высокія абцасы і вялікая платформа. Не саступаюць ім і басаножкі з адкрытай пятой і носам. Але туфлі на шпільцы — самая папулярная мадэль, якая падаўжае ногі, падкрэслівае жаноцкасць і вытанчанасць.

Вельмі важна абраць не проста самы-самы прыгожы абутак, але і самы зручны, бо на выпускным вечары трэба выглядаць бадзёрай, быць у добрым настроі і рухацца, а не сядзець збоку, хаваючы пад крэсла стомленыя ад хады ногі.

### УСЯ СПРАВА Ў... КАШУЛІ

Што да хлопцаў, то некаторым з выбарам вызначыцца цяжка, бо хочацца выглядаць арыгінальна і не засяроджвацца на класічным стылі. Тут часам узнікае пытанне: што выбраць — смокінг ці касцюм? Чым жа першы адрозніваецца ад другога? У смокінгу пінжак на грудзях вельмі адкрыты. Каўнер можа быць самым розным: класічны, паўкруглы ці так званы «рыбін рот». Як правіла, з уборам надзяваецца стужка-пояс, выкана1ная з атласу. Да смокінга цяжка падабраць кашулю. Лепш, калі яна будзе белая і абавязкова з падвойным манжэтам. Няправільны колер можа сапсаваць строгую каляровую гаму, у выніку чаго смокінг страціць сваю афіцыйнасць і ператворыцца ў паўсядзённы ўбор. Туфлі пажадана падбраць чорныя з бліскучай паверхняй, нізкім абцасам і трохі падоўжаным носам.

Калі ж выбар спыніўся на касцюме, не трэба баяцца, што вы будзеце выглядаць занадта строга. У модзе па-ранейшаму касцюмы ў цёмных адценнях — ад чорнага да сіняга. Карыстаюцца папулярнасцю і карычневыя з шэрымі. Можна паспрабаваць колеры камбінаваць. Але трэба быць асцярожным, каб не ператварыць касцюм ва ўбор для «карнавалу».

### І ГЭТА НЕ ЎЛІЧВАЮЧЫ ДРОБЯЗЯЎ...

Застаецца галоўнае пытанне: дзе знайсці такі ўбор, які б задавальняў па ўсіх параметрах? Дзяўчаты баяцца быць падобнымі адна на адну, таму купляюць адзенне ў розных гарадах краіны, але часцей за ўсё пакупкі робяцца ў мінскіх крамах, дзе прадаецца імпартнае адзенне. Тут сукенка будзе каштаваць ад 1 да 3 мільёнаў беларускіх рублёў. Для тых, хто дакладна хоча вылучацца сярод іншых, застаецца толькі пашыць сукенку на заказ, але гэта патрабуе больших матэрыяльных і маральных выдаткаў. Добрая і якасная тканіна каштуе прыкладна каля 2 мільёнаў рублёў, і гэта без астатніх дробязяў: падкладачнай тканіны, «маланкі», сеткі, кнопак і г.д. Гэта яшчэ плюс 1 мільён, і за пашыў бяруць каля 400 тысяч рублёў. А яшчэ патрэбны туфлі, макіяж, прычоска.

**Галоўным трэндам 2013 года стануць кактэйльныя сукенкі. Яны не патрабуюць дадатковага дэкору — досыць будзе дарагой тканіны і правільна падабраных аксесуараў.**

Смокінг ці касцюм для хлопцаў абыдзецца ў не меншую суму. Да ўбору ж таксама патрэбна дакупіць туфлі, кашулю, гальштук і рэмень. А гэта ў суме — каля трох мільёнаў рублёў.

### АРЫГІНАЛЬНАЕ ЦІ ПРАКТЫЧНАЕ?

А чым кіраваліся выпускнікі мінулага года пры выбары свайго святочнага ўбору?

**Вікторыя Чаплева:**

— Мая выпускная сукенка так і вісіць у шафе, пасля балю я больш нікуды яе не апранала. Абцасы ж туфляў былі настолькі высокія, што адразу пасля свята я закінула туфлі куды падалей і паабяцала сабе больш да іх нават не дакранацца.

**Валерыя Булва:**

— Я лічу, што на выпускны трэба купляць такую сукенку, якую можна потым смела апрануць. Мне здаецца, траціць велізарныя грошы на штосьці «суперасаблівае», проста неразумна. Менавіта з такім перакананнем я выбірала сваю выпускную сукенку. Аднак у мяне гэта не зусім атрымалася, я доўга не магла вызначыцца і купіла тое, што проста запала ў душу. Не магу сказаць, што адважна апрану сукенку проста так... А вось туфлі я купіла вельмі прыгожыя, я іх і цяпер нашу, але рэдка. Берагу...

**Алеся Серада:**

— Набываючы выпускную сукенку, я не думала пра тое, куды я яе потым апрану. Гэта для мяне як вяселле — усяго адзін раз у жыцці. Таму я не асабліва хвалююся, што ні разу не апранула ўбор пасля. А ў басаножках яшчэ хадзіла ўлетку, яны не прызначаны для прагулак па горадзе, але калі-нікалі іх можна абуць.

**Аляксандр Бярэзіч:**

— Мой выбар прыпаў на смокінг. Зараз я вельмі рэдка апранаю яго, бо ўбор падыходзіць толькі для асабліва важных мерапрыемстваў.

**Маргарыта КУХТА,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Бацькоўскі сход*

# «ДАРАГІЯ» ВЫПУСКНІКІ...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Самым яскравым пасля майго выпускнога быў успамін пра... жудасны боль у нагах. Крыху не разлічыла, што танцаваць усю ноч у басаножках на шпільках наўрад ці магчыма. Не, безумоўна, засталіся ўражанні і ад цудоўнай дыскатэкі, і ад сустрэчы світання на абсалютна пустым мосце, на якім удзень процьма машын... Але, тым не менш, памяць мае такую вось дзіўную ўласцівасць — самастойна выбіраць самае запамінальнае. А вось сумы выдаткаў на выпускны зусім не памятаю. Можа, учарашняму школяру гэта не так ужо і важна, а вось у бацькоў пытанне звычайна выклікае вялікую цікавасць і хваляванне...**

...Прашу заўважыць, што паміж гэтымі гісторыямі — адлегласць у 300 кіламетраў, але розніца, якая вымяраецца ў грашовым эквіваленце, — далёка не 300 і нават не 800 тысяч беларускіх рублёў...

...З Ангелінай мы пазнаёміліся ў Мінску на майстар-класе па макіяжы. Высветлілася, што ў дзяўчыны сёлета плануецца выпускны баль і яна ўжо замовіла сабе цырульніка і візажыста. Мама Ангеліны, Таццяна Віктараўна, па просьбе дачкі не адмовілася расказаць журналісту пра кошт асобна ўзятага сталічнага выпускнога — з умовай не называць нумар школы.

Што ж, гэта можна. Па словах Таццяны Віктараўны, для яе выпускніцы былі куплены два строі. Адзін — класічная чорная сукенка з раменьчыкам, даўжынёй да калена, якую дачка апране на апошнюю лінейку, а другі — доўгая сукенка каралавага колеру з адкрытай спінай, непасрэдна для выпускнога балю.

— На адзенне для дачкі мы выдаткавалі дзесьці 1,5 мільёна рублёў. Куплялі ўсё ў Мінску, хоць сябры і раілі з'ездзіць у Вільнюс ці Беласток. Таксама сукенку за 800 тысяч рублёў я купіла для сябе, — расказала мама Ангеліны.

Туфлі адпаведнага колеру і ўпрыгажэнні для ўсіх убораў знайшліся дома. Як пажартавала Таццяна Віктараўна, «гэтага дабра ў нашым жаночым царстве заўжды хапае» (у сям'і, акрамя таты, — мама, дзве дачкі, а таксама сабака і кошка жаночага полу). Цырульнік і візажыст прыедуць на дом і «навядуць прыгажосць» адразу маме і дачцэ прыкладна за 120 долараў.

Цяпер час прыгадаць і пра іншыя выдаткі. Клас Ангеліны адзначае выпускны ў рэстаране, які замаўлялі ледзь не за паўгода. З кожнага выпускніка — 350 тысяч рублёў за банкет і 70 тысяч рублёў — за арэнду залы.

— У рэстаран запрашаюць і бацькоў, таму на мяне з мужам — такія ж расходы, — удакладняе Таццяна.

Не забыцца б узгадаць пра падарунак школе, на які кожны выпускнік здае па 10 долараў. На падарунак класнаму кіраўніку дзеці «скідваюцца» па 100 тысяч рублёў. Фотаальбом класа! Як жа без яго?! На гэтае задавальненне з кожнага яшчэ па 15 долараў. Ну, і дробязі ў выглядзе кветак настаўнікам, выпускных стужак і званочкаў — па 110 тысяч з кожнага.

Калі палічыць, атрымліваецца 145 долараў плюс больш за 3,5 мільёна рублёў. У адказ на маё здзіўленне ад пачутай лічбы Таццяна гаворыць:

— Гэта, зразумела, нямала, але мы былі гатовы да выдаткаў. Да іх патрэбна быць гатовым усё жыццё, паколькі сям'я ўзяла на сябе адказнасць нарадзіць і выгадаваць дзіця. Мы з мужам і на вучобу дачкі збіралі грошы загадзя, дык чаму б не патраціць крыху на выпускны?

У Ангеліным класе ёсць і такія, хто не ідзе на выпускны альбо адпраўляецца ў рэстаран адзін, без бацькоў.

— Я ўпэўнена, што весела адсвяткаваць можна і без «шыку», але што ў нас такога шыкоўнага? Яхты, лімузіны і шакаладныя фантаны — гэта ўжо залішняе. Ніхто і не збіраецца ўсё гэта замаўляць для выпускнога...

**Калі палічыць, атрымліваецца 145 долараў плюс больш за 3,5 мільёна рублёў. У адказ на маё здзіўленне ад пачутай лічбы Таццяна гаворыць: — Гэта, зразумела, нямала, але мы былі гатовы да выдаткаў.**

...Наталля Дзмітрыеўна жыве ў Кобрынскім раёне, у вёсцы. У сям'і, акрамя старэйшага сына Антона, пра якога пойдзе гаворка, ёсць яшчэ і малодшы сын. Антон сёлета ўжо не выпускнік, а шчаслівы першакурснік, аднак успаміны пра выдаткі на мінулагодні «абрад» развітання са школай, як кажуць, жывыя і дагэтуль.

— Калі б можна было адзначыць больш сціпла, я б без размоў згадзілася, — дзеліцца Наталля Дзмітрыеўна. — Некаторым гэтае мерапрыемства абышлося ледзь не ва ўсю бацькоўскую зарплату.

Якія ж яны, складнікі выпускнога ў вясковай школе? Самае галоўнае — касцюм для сына. Тут Антону пашанцавала. Выдатную «пару» атрымалі «ў спадчыну», зусім бясплатна. Усё роўна хлопец больш цягнецца да спартыўнага стылю ў адзенні, нешта строгае апранае рэдка, таму набытыя рэчы так бы і засталіся пасля выпускнога вісець у шафе. Давялося дакупіць толькі кашулю за 150 тысяч рублёў і чаравікі прыкладна за 250 тысяч.

— У нас многіх выручае тое, што Украіна зусім побач, — расказвае Наталля Дзмітрыеўна. — Калі «раптам» вяселле, выпускны ці яшчэ што, людзі абавязкова стараюцца выбрацца туды «на шопінг». Шмат на чым удаецца эканоміць. Напрыклад, касцюм для выпускніка можна купіць за 300 тысяч рублёў.

У класе Антона было 14 чалавек. Рэстарана ў вёсцы няма, таму стол накрылі ў школе, дыскатэкай «забяспечыў» мясцовы Дом культуры. Выпускнікі не частаваліся нічым звышшыкоўным: садавіна, сок, цукеркі, бутэрброды. Калі не лічыць выдаткаў на ўласны выгляд, на выпускны кожны патраціў 300 тысяч рублёў. Прычым у гэту суму ўвайшлі і стужкі для выпускнікоў, і падарункі класнаму кіраўніку, школе, кветкі і прадукты для стала.

Атрымліваецца, выпускны Антона каштаваў 700 тысяч беларускіх рублёў.

Жанчына прызналася, што ў любым выпадку пастаралася б не выходзіць за межы аднаго мільёна рублёў.

...Не буду браць на сябе адказнасць і разважаць, хто з маіх суразмоўцаў аказаўся ў выйгрышы. Удакладню толькі, што суму, якую наша сям'я патраціла на мой выпускны, не ўдалося ўзгадаць нават з дапамогай мамы, якая за пяць гадоў на ўсе гэтыя лічбы таксама паспяхова забылася.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# ЯК ВЫБРАЦЬ ПРАФЕСІЮ І НЕ ПАДАРВАЦЬ ЗДАРОЎЕ?



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар «ЧЗ».)**

Напрыклад, ёсць цэлы шэраг прафесій, пры засваенні якіх неабходна адрозніваць колеры. З парушэннямі колераадчування немагчыма выконваць мантажныя работы ў радыё- і электратэхнічнай прамысловасці, асобныя віды работ у швейнай і абутковай вытворчасці, а таксама ў будаўніцтве.

Маладым людзям з захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы хоць і праблематычна, аднак усё ж такі магчыма падабраць спецыяльнасць у прафесійна-тэхнічных установах. У той жа час яны могуць навучацца па шэрагу спецыяльнасцяў у сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах.

**«Адна з галоўных памылак заключаецца ў тым, што спачатку абітурыенты выбіраюць прафесію, а ўжо затым сутыкаюцца з сітуацыяй, калі ўрач ставіць іх перад фактам: работа ў той ці іншай сферы маладому чалавеку супрацьпаказана...»**

З захворванняў дыхальнай сістэмы ў падлеткаў дастаткова часта сустракаюцца хранічны бранхіт і бранхіяльная астма. З хранічным бранхітам супрацьпаказаны работы, звязаныя са знаходжаннем у неспрыяльных метэаралагічных умовах, асабліва пры паніжанай тэмпературы паветра, павышанай вільготнасці, на скразняках. Не рэкамендуюцца ім і работы, звязаныя з вялікім фізічным і нервова-псіхалагічным напружаннем ва ўмовах уздзеяння пылу і таксічных рэчываў. Бранхіяльная астма мае алергічную прыроду, таму нашкодзіць могуць любыя знешнія ўмовы, якія зніжаюць ахоўныя функцыі арганізму. Як і пры іншых захворваннях органаў дыхальнай сістэмы, падлеткам з бранхіяльнай астмай супрацьпаказаны значныя фізічныя і нервова-эмацыянальныя нагрузкі, неспрыяльныя метэаралагічныя і мікракліматычныя фактары, пыл, таксічныя рэчывы, а таксама кантакт з рэчывамі, якія валодаюць алергічным уздзеяннем. Так, падлеткі з бранхіяльнай астмай не могуць навучацца прафесіям хімічнай, фармацэўтычнай прамысловасці, не могуць працаваць на абутковай вытворчасці, дзе прымяняюцца гумавыя клеі. Стаматалогія, дарэчы, ім таксама супрацьпаказана.

З захворваннямі страўнікава-кішачнага тракту супрацьпаказаны работы, пры якіх праблематычна прытрымлівацца рэгулярнага рэжыму харчавання (напрыклад, з частымі раз'ездамі, камандзіроўкамі), работы, звязаныя з вымушанай нязручнай рабочай позай, якая выклікае напружанне мышцаў брушной сценкі, з уздзеяннем таксічных рэчываў, шуму і вібрацыі...

## Акуляры — яшчэ не прысуд

**— А ці ёсць нейкія медыцынскія супрацьпаказанні для таго, каб працаваць праграмістам? Скажам, наколькі важнае значэнне мае для праграміста добры зрок?**

— Пры паступленні на спецыяльнасці радыётэхнічнага каледжа прадугледжаны адны супрацьпаказанні, а пры паступленні на IT-спецыяльнасці ва ўстановы вышэйшай адукацыі — іншыя. Тут патрэбен індывідуальны падыход. Увогуле, пры падборы прафесіі для падлетка з адхіленнямі з боку органа зроку трэба ўлічваць шмат акалічнасцяў, бо адно і тое ж парушэнне зрокавых функцый можа быць пры розных формах вочнай паталогіі. І толькі з улікам клініка-функцыянальнага прагнозу, стадыі і ступені кампенсацыі паталагічнага працэсу можна правільна зарыентаваць маладога чалавека ў плане выбару прафесіі. Падлеткам з высокай ступенню блізарукасці мы рэкамендуем прафесіі, не звязаныя з фізічным напружаннем, вібрацыяй, частымі нахіламі галавы, з сістэматычнымі нагрузкамі для зроку.

**«З парушэннямі колераадчування немагчыма выконваць мантажныя работы ў радыё- і электратэхнічнай прамысловасці, асобныя віды работ у швейнай і абутковай вытворчасці, а таксама ў будаўніцтве...»**

Абітурыентам з малой і сярэдняй ступенню блізарукасці пры добрай карэкцыі зрокавых парушэнняў асаблівых абмежаванняў пры выбары прафесій, дзе дапускаецца нашэнне акуляраў, няма. Пры наяўнасці дальназоркасці, асабліва сярэдняй і высокай ступені, супрацьпаказана праца, якая патрабуе сістэматычнага напружання зроку, напрыклад, работа з дробнымі дэталямі. Таксама пры падборы прафесій для падлеткаў з адхіленнямі з боку органаў зроку вялікае значэнне мае магчымасць карыстацца на працы акулярамі. Аднак акулярамі немагчыма карыстацца пры значных перападах тэмператур, калі шкло ў іх пацее, ва ўмовах павышанай запыленасці асяроддзя, пры нязручнай вымушанай рабочай позе, калі ёсць неабходнасць выкарыстоўваць іншыя ахоўныя прыставанні для вачэй. Вастрыня зроку для выканання работ у такіх умовах павінна быць добрай без карэкцыі.

**— Няўжо і для работы юрыста таксама ёсць медыцынскія супрацьпаказанні?**

— У групу медыцынскіх супрацьпаказанняў да навучання ў ВНУ па спецыяльнасці «правазнаўства» ўваходзяць трывалае значнае зніжэнне слыху і значнае заіканне (лаганеўроз).

## Не крыўдуйце на ўрачоў

**— Алена Васільеўна, магчыма, вы прытрымліваецеся іншай думкі, але мне здаецца, што ў паліклініках нярэдка практыкуецца даволі фармальны падыход да афармлення абітурыентамі медыцынскай даведкі. Да таго ж абітурыент і яго бацькі могуць свядома ўтаіць ад урача інфармацыю пра тое, што ў падлетка з'явіліся са здароўем праблемы. А яшчэ можна паспрабаваць угаварыць урача, каб той не пазбаўляў чалавека яго прафесійнай мары...**

— З-за свайго ўзроставага максімалізму падлеткі часта катэгарычна не жадаюць прызнаваць сябе хворымі. Таму не давесці да ўрача інфармацыю пра сваё здароўе ў поўным аб'ёме абітурыент і сапраўды можа. Магчыма, яму нават пашанцуе расчуліць урача. Але хачу папярэдзіць, што афармленне медыцынскай даведкі, якая становіцца фактычна пропускам у будучую прафесію, не пустая фармальнасць. Мэта медыцынскага абследавання — вызначыць прыдатнасць да будучай прафесіі. Шкада будзе затрачаных сродкаў, часу і сіл, калі факт прафесійнай непрыдатнасці будзе ўстаноўлены бліжэй да заканчэння навучання ці ўвогуле ўжо пасля размеркавання на першае працоўнае месца. Таму, здзяйсняючы выбар прафесіі, трэба браць пад увагу ўсё: не толькі цяперашні стан здароўя, але і тое, як будучая прафесія можа адбіцца на вашым здароўі, ці не выкліча яна абвастрэнне хранічных захворванняў, якія ўжо ёсць, або з'яўленне новых захворванняў. Адным словам, пры выбары прафесіі ніякіх дробязяў не бывае!

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Парады бывалых*

# КАЛІ РОЗУМ ЁСЦЬ, ЦТ — НЕ КАНЕЦ СВЕТУ

**У ВНУ Беларусі завяршаецца запіс на цэнтралізаванае тэсціраванне.**
**Адзінаццацікласнікам сёлета не пашанцавала — планка мінімальнага бала на ЦТ узрасла: руская і беларуская мовы — 10, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія — 15, гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя, грамадазнаўства, геаграфія, замежныя мовы — 20 балаў. Між іншым, вырашыць лёс можа і адзін бал, так што расслабляцца нельга. Як жа пераадолець стрэс? На што звярнуць асаблівую ўвагу, каб экзамены прайшлі без праблем? Распавядаюць і даюць парады абітурыенты 2012 года.**

***Яна КАСЦЯН, Інстытут журналістыкі БДУ:***

— За рускую мову на ЦТ атрымала 70 балаў, хоць разлічвала на большае. Усё таму, што дапамагала іншагародняй дзяўчынцы-суседцы, якая сядзела справа, і не паспела надаць належнай увагі сваёй уласнай рабоце. Самым вялікім «матыватарам» было разуменне: за мяне ніхто не вывучыць. Прыйшлося «забіваць» сваю ляноту і зубрыць — не без дапамогі рэпетытара. Затое паступіла на бюджэт! Мая парада — грунтоўна падыходзіць да дробязяў, нават тое, што здаецца простым, паўтарыць. Бывае, памятаеш і тое, што амаль не вучыла, а нейкія асноўныя правілы і даты, наадварот, вылятаюць з памяці.

***Аліса ПЯТРОВА, факультэт маркетынгу і лагістыкі БДЭУ:***

— Набрала 333 пры прахадным бале 319, але нельга сказаць, што я вельмі старалася. Проста бегала да рэпетытараў, рашала тэсты, адпрацоўвала матэрыял. З англійскай мовай вельмі дапамаглі зборнікі ЦТ мінулых гадоў: я прыйшла на экзамен і зразумела, што ведаю амаль усе «падводныя камяні». Даволі вялікай перашкодай стала школа, бо ў выпускным класе для атэстата важная кожная адзнака, а некаторыя настаўнікі былі ўпэўнены, што іх прадмет (які я, як правіла, не здавала ні на іспытах, ні на ЦТ) самы важны. Час ад часу дзеля «дзясяткі» прыходзілася выконваць процьму працы, хоць атрыманыя веды ніяк не спатрэбіліся. Мне здаецца, галоўнае ў падрыхтоўцы — не «перавучыцца» і ставіцца да іспытаў спакойна. Калі розум ёсць — паступіш, а калі не — не ўратуе ніякае завучванне.

***Максім ЯРАШЭНКА, архітэктурны факультэт БНТУ:***

— Са школьнымі іспытамі наогул не «парыўся»: амаль усё спісаў са шпаргалак, затое вельмі шмат увагі надаваў творчым дысцыплінам — малюнку, чарчэнню, кампазіцыі. У выніку ў мяне за ЦТ па матэматыцы ўсяго толькі 63 балы, затое выдатныя адзнакі па «творчасці». На ЦТ шпаргалкі ўзяць, вядома, не рызыкнуў, хоць мая аднакласніца скарысталася старым прыёмам: надзела кароткую спадніцу і запісала трыганаметрычныя формулы пад ёй проста на нагах. Не ведаю, наколькі ёй гэта дапамагло, але ўсё прайшло добра — ніхто не заўважыў пад партай яе «выкрутасаў». Не разумею людзей, якія моцна нервуюцца перад ЦТ. Я сябе супакоіў даволі хутка. Проста сказаў: «Ужо нічога не зменіць. На колькі балаў ведаеш, на столькі і напішаш».

***Валерый ТРАЦЦЯК, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ:***

— Рыхтаваўся ўсур'ёз апошнія тры месяцы перад ЦТ. Тады мне здавалася, што я «пашу» ледзь не цэлымі днямі і раблю неймаверныя намаганні, але цяпер, аналізуючы ўсё, разумею, што больш ныў і накручваў сябе, чым сапраўды вучыў. Абітурыентам варта перастаць скардзіцца самім сабе і іншым, наколькі ім цяжка даецца ЦТ. Прыйдзеце ва ўніверсітэт і зразумееце, што гэта былі толькі «кветачкі». На мой погляд, лепш як мага раней зразумець, што ЦТ на самой справе — гэта даволі проста і не мучыць сябе стрэсамі. А калі бярэшся за вучобу — лепш за ўсё садзіцца адразу гадзін на 5-6, ізаляваць сябе ад знешняга свету і менавіта «пахаць».

***Ганна ГУРЫНА, факультэт англійскай мовы МДЛУ:***

— Даводзілася прымушаць сябе вучыцца. Прасіла бацькоў ставіць пароль на камп'ютар, адключала тэлефон, але часам так не хацелася садзіцца і зубрыць правілы, што я прыбірала кватэру ці нават садзілася перачытваць «Вайну і мір». У выніку зразумела, што так магу і «праляцець» на ЦТ, і, нарэшце, засела ўсур'ёз. Выпрацавала для сябе план: дзве гадзіны ў дзень адвесці для падрыхтоўкі да паступлення, астатні ж час займацца тым, чым захочацца.

***Паліна ПАТАПІНА, лячэбны факультэт БДМУ:***

— Настаўнікі, калі мы прыйшлі 1 верасня ў 11-ы клас, адразу пыталіся, хто здае менавіта іх прадмет, і якраз гэтых людзей «грузілі» заданнямі, а таксама ладзілі дадатковыя заняткі. Такім чынам я пры дапамозе школьных факультатываў і заняткаў на ўроках добра вывучыла і хімію, і біялогію. Ну і выконвала ЦТ мінулых гадоў: калі бачыш канкрэтныя прыклады заданняў, лягчэй вучыць, таму што ты ўжо ведаеш, чаму варта надаваць асаблівую ўвагу. Раю ўважліва выбіраць ВНУ, дзе вы збіраецеся пісаць тэсціраванне. У БДУ, па аповедах людзей, якія здавалі там, вельмі складана: горача ў аўдыторыях, усе вельмі цесна сядзяць, назіральнікі не дазваляюць нават зірнуць у акно лішні раз. Мне здаецца, больш зручна здаваць ЦТ у невялікіх ВНУ. Там не такая напружаная атмасфера: ад нерваў можна не толькі нарабіць памылак, але і няправільна запоўніць бланк.

❒❒❒

Як паказвае практыка, цэнтралізаванае тэсціраванне — зусім не канец свету. Галоўнае тут — умець сябе арганізаваць і не перанервавацца. І нават калі здаецца, што ўжо не паспееш вывучыць усё неабходнае да іспыту, не варта спыняцца. Магчыма ўсё — трэба толькі пастарацца. Поспехаў і простых заданняў на ЦТ, абітурыенты!

**Кацярына ЖОРАВА.**

**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 7 ИЮНЯ 2013 г. ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»**

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1 | Помещение на 2-м этаже капитального строения, здания 21 городского отделения связи (инв. №100/С-45930), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Орловская, д. 24 | 4 018 350 | 401 835 | 186,9, в т.ч. 165,5 (19,2; 14,5; 14,3; 16,7; 13,7; 11,4; 10,6; 65,1) всп. пл. 21,4 (8,1; 6,1; 1,0; 1,5; 4,7) | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды | | | | | |
| Наименование арендодателя | РУП «Белпочта» | | | | | |
| Срок договора аренды | 5 лет | | | | | |
| Условия | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб.дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб.дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. | | | | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в рег. дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369 УНП 102353509 | | | | | |

**Аукцион состоится 7 июня 2013 г. в 11.00 (лот №1) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**
**Последний день приема заявлений – 06 июня 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

**ЗАО «РРБ-Банк» сообщает, что 28 мая 2013 года**

Правлением ЗАО «РРБ-Банк» (Протокол № 29 от 28.05.2013) утверждены изменения № 3 в Правила организации обслуживания счетов клиентов Банка – юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, которые вступают в силу через пять банковских дней с момента публикации. УНП 100361187

# Тры этапы падрыхтоўкі ў каледжы сувязі:
# РАБОЧЫ, ТЭХНІК, ІНЖЫНЕР

220114, г. Мінск, вул. Ф. Скарыны, д. 8/2, **вучэбны корпус № 1.**
Тэл.: (017) 267 44 14.
220013, г. Мінск, вул. П. Броўкі, д.14, **вучэбны корпус № 2.**

**Віцебскі філіял:**
220114, г. Віцебск, вул. Ільінскага, д. 45.
Тэл.: (021) 237 46 85.



Рэктар Андрэй ЗЯНЕВІЧ.

**У Вышэйшым дзяржаўным каледжы сувязі дзейнічае фактычна трохузроўневая сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў. На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі па шэрагу дысцыплін — матэматыка, фізіка, начартальная геаметрыя і інжынерная графіка, тэорыя электрычных ланцугоў, тэорыя электрычнай сувязі і інш. — падрыхтоўка вядзецца па праграмах вышэйшай школы. Гэта дае магчымасць скараціць тэрмін навучання на ўзроўні вышэйшай адукацыі ў параўнанні з тэрмінам традыцыйнага навучання на 2 гады 8 месяцаў.**

— У нашу навучальную ўстанову паступаюць як пасля базавай школы — 9 класаў, так і па завяршэнні сярэдняй школы — 11 класаў, — тлумачыць **рэктар Вышэйшага дзяржаўнага каледжа сувязі, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Андрэй ЗЯНЕВІЧ.** — Па сутнасці, у нас можна атрымаць спачатку кваліфікацыю рабочага, затым тэхніка і, нарэшце, інжынера.

Мы робім вялікую стаўку на практычную падрыхтоўку. Наш спецыяліст здольны прыступіць да працы фактычна без працэсу адаптацыі. Можна сказаць, каледж стаў першым, хто пачаў адкрываць вучэбныя цэнтры. На базе ўстановы размешчаны вучэбныя цэнтры некалькіх замежных кампаній. Так, сумесна з карпарацыяй Cisco Systems, сусветным лідарам у галіне інтэрнэт-тэхналогій і абсталявання для сетак перадачы даных, яшчэ ў 2005 годзе пры каледжы адкрылася Рэгіянальная сеткавая акадэмія Cisco. З 2009 года мы атрымалі статус аўтарызаванага Цэнтра тэсціравання Pearson VUE, які з'яўляецца часткай карпарацыі Pearson Education, вядомага тэставага правайдара, які прапануе камп'ютарнае сертыфікацыйнае тэставанне па прадуктах вядучых вытворцаў праграмнага забеспячэння. Акрамя таго, на факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў працуюць вучэбныя цэнтры карпарацый ZTE і Huawei Technologies Co. (Кітай) — вядучых пастаўшчыкоў сусветных вытворцаў тэлекамунікацыйнага абсталявання і пастаўшчыкоў сеткавых рашэнняў, аўтарызаваны вучэбны цэнтр фірмы «1С» па праграме «1С: Бухгалтэрыя» (Расія), вучэбны цэнтр кампаніі ААТ «Сувязьінвест» (Беларусь), вучэбны цэнтр РУП «Белпошта» (Беларусь). Гэтыя кампаніі прадастаўляюць нам тое тэхнічнае абсталяванне і праграмнае забеспячэнне, якое пастаўляецца непасрэдна на прадпрыемствы сувязі. Так што наш выпускнік, калі прыходзіць на работу, адразу пачынае працаваць, а не знаёміцца з абсталяваннем.

Разам з тым, вялікая ўвага надаецца і тэарэтычнай падрыхтоўцы. У нас яна ажыццяўляецца як у форме лекцый, так і ў форме заняткаў, што прымушае вельмі і вельмі добра рыхтавацца. Таму мы маем магчымасць ганарыцца нашымі прызёрамі рэспубліканскіх алімпіяд — па той жа матэматыцы, інфармацыйных і сеткавых тэхналогіях.

З наступнага навучальнага года каледж першым сярод навучальных устаноў пачне падрыхтоўку па такой спецыяльнасці, як «Тэставанне і праграмнае забеспячэнне». У нас для гэтага ёсць адпаведны тэхнічны і кадравы патэнцыял. Упершыню адкрываем і спецыялізацыю «Радыёсістэмы аховы і тэленазірання» — вельмі запатрабаваны зараз кірунак, паколькі сістэма назірання розных аб'ектаў актыўна пачала развівацца. Каледж застаецца адзіным у краіне, хто рыхтуе спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для паштовай сувязі — інжынераў паштовай сувязі.

**ВЫШЭЙШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ КАЛЕДЖ СУВЯЗІ — гэта вучэбная ўстанова Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь са шматузроўневай падрыхтоўкай. У выпадку паспяховай здачы ўступных экзаменаў, выпускнікі ўзроўню сярэдняй спецыяльнай адукацыі залічваюцца на ўзровень вышэйшай адукацыі каледжа на адпаведныя спецыяльнасці.**



На занятках.

У нас моцныя міжнародныя сувязі, — скажам, з Маскоўскім тэхнічным універсітэтам сувязі і інфарматыкі, Адэскай акадэміяй сувязі імя А.С. Папова, Кіеўскім каледжам сувязі, Архангельскім міжнародным інстытутам кіравання. Нядаўна мы ініцыявалі правядзенне міжнароднага конкурсу Клуба вясёлых і знаходлівых, куды запрасілі каманды з Новасібірска, Самары, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Адэсы. Каманда нашага каледжа заняла другое месца. Днямі ў Віцебску, дзе размяшчаецца наш філіял, адбылася і міжнародная эканамічная алімпіяда з удзелам нашых і расійскіх студэнтаў.

Нядаўна адкрылі цэнтр дыстанцыйнага навучання. Згодна з заключаным з Азербайджанскім тэхнічным універсітэтам пагадненнем, нашы педагогі будуць чытаць лекцыі для азербайджанскіх студэнтаў, і наадварот. Не так даўно адбылася відэаканферэнцыя з Маскоўскім тэхнічным універсітэтам сувязі і інфарматыкі і казахстанскім Міжнародным універсітэтам інфармацыйных тэхналогій. Наогул на прасторы краін Садружнасці дзейнічае пастаянная канферэнцыя рэктараў тэлекамунікацыйных ВНУ. Ад Беларусі ў канферэнцыі ўдзельнічае толькі наш каледж. Штогод рэктары адпаведных навучальных устаноў абмяркоўваюць стварэнне адзінай адукацыйнай прасторы ў галіне сувязі, імкнуцца ўзгадняць і карэктаваць вучэбныя планы такім чынам, каб на падобных спецыяльнасцях была адпаведная падрыхтоўка. Калі ёсць неабходнасць, дадаюцца новыя раздзелы, звязаныя з сучаснай тэхнікай і тэхналогіямі, якія пачынаюць выкарыстоўвацца ў сувязі.

А такая неабходнасць зараз ёсць фактычна пастаянна. Сёння мы яшчэ карыстаемся GSM-тэхналогіяй перадачы даных з падтрымкай 3G, аднак ужо ёсць тэхналогія LTE, што забяспечвае яшчэ больш высакахуткасную перадачу даных. У кожны новы дом адразу праводзіцца аптычнае валакно, па якім карыстальнікі атрымаюць паслугі тэлефоннай, тэлевізійнай і інтэрнэт-сувязі. А для таго, каб гэта ажыццявіць, патрэбны якраз спецыялісты, якіх мы рыхтуем.

У нас 100-працэнтнае размеркаванне, і ўсе студэнты вельмі запатрабаваныя. Практыка паказвае, што фактычна ніхто не сыходзіць з галіны, абсалютная большасць працуе і некаторыя нават рухаюцца ўверх па кар'ернай лесвіцы.

Летась сярэдні конкурс быў 2,5 чалавека на месца. Аднак калі па такой спецыяльнасці, як «Сеткі тэлекамунікацый» (са спецыялізацыямі «Тэхнічная эксплуатацыя сетак тэлекамунікацый», «Праграмнае забеспячэнне сетак і тэлекамунікацый», «Лінейна-кабельныя збудаванні сувязі»), конкурс складаў 2,7-3,1 чалавека на месца, то на «Сістэмы радыёсувязі, радыёвяшчання і тэлебачання» — 2,2, а на «Паштовую сувязь» — яшчэ крыху менш.

У нас вельмі добрая ўсебаковая падрыхтоўка спецыялістаў, сур'ёзная выхаваўчая работа; прадуманы і такі момант, як баўленне вольнага часу. Ёсць чатыры інтэрнаты з добрымі ўмовамі, куды ўладкоўваем усіх іншагародніх.

УНП 100211963

**Святлана БАРЫСЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.**

# НА МОВЕ БІЗНЕС-КАМУНІКАЦЫЙ




**Сёлета Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт адзначае сваё 80-годдзе. Адначасова дзесяцігадовы юбілей адзначае і самы малады ў ВНУ факультэт міжнародных бізнес-камунікацый. На нашы пытанні адказвае дэкан ФМБК, кандыдат філалагічных навук Наталля ПАПОК.**

***— Наталля Усеваладаўна, што ўяўляюць сабой выпускнікі вашага факультэта, якімі ведамі і навыкамі яны валодаюць?***

— Граматнае валоданне камунікатыўнымі тэхналогіямі ў бізнесе — ледзь ці не галоўны сакрэт дзелавога поспеху. Асаблівасць спецыялістаў нашага факультэта — у спалучэнні галін, якія, здавалася б, маюць мала агульнага паміж сабой, — эканомікі і лінгвістыкі. Менавіта спалучэнне базавых ведаў у галіне эканомікі са свабодным валоданнем замежнымі мовамі, прыёмамі міжкультурнай камунікацыі і навыкамі псіхалогіі дзелавых адносін робіць выпускнікоў факультэта ўнікальнымі спецыялістамі, запатрабаванымі ў нашай краіне.

***— Гэта значыць, вы выхоўваеце бізнес-эліту краіны?***

— Сам па сабе бізнес — адна з найбольш дынамічных і пластычных формаў чалавечай дзейнасці. На нашым факультэце мы робім акцэнт на камунікатыўным яго складніку, прычым у міжнародным кантэксце. Прафесійныя перспектывы нашых выпускнікоў абумоўлены тым, што ў сучасным свеце дзелавыя зносіны паміж людзьмі становяцца ўсё больш інтэнсіўнымі. XXI стагоддзе не без падстаў называюць стагоддзем камунікацый. Сёння вялізная колькасць спецыялістаў актыўна ўдзельнічае ў дзейнасці міжнародных палітычных, эканамічных і прафесійных арганізацый, рабоце міжнародных форумаў і канферэнцый. Як паказвае вопыт, для падтрымання разнастайных шматузроўневых кантактаў і формаў зносін неабходна веданне не толькі замежнай мовы, але таксама нормаў і правілаў іншамоўнай культуры, псіхалогіі і гісторыі. Нарэшце, патрабуецца веданне структуры працэсу зносін, асабліва ў сферы бізнес-камунікацый, для яго прагназавання, каб пазбегнуць няправільнага разумення партнёраў.

***— Навыкі бізнес-камунікацый на базавай аснове эканомікі — гэта новае слова ў нашай сістэме вышэйшай адукацыі...***

— Дзесяць гадоў таму ва ўніверсітэце з'явілася спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (знешнеэканамічныя сувязі)», што пацягнула за сабой стварэнне новага факультэта — факультэта міжнародных бізнес-камунікацый. Факультэт аб'ядноўвае кафедры замежных моў, якія існавалі на той момант, а таксама кафедру беларускай і рускай моў. Выпускаючай кафедрай для новай спецыяльнасці стала кафедра міжкультурнай эканамічнай камунікацыі. Сваю місію мы бачым у падрыхтоўцы спецыялістаў, здольных кампетэнтна прымаць удзел у кіраўнічай, эканамічнай, праваной і сацыяльнай дзейнасці.

***— Што ўяўляе сабой лінгвістычная падрыхтоўка ў рамках факультэта?***

— Вучэбным планам прадугледжана вывучэнне дзвюх замежных моў, прычым асноўная (першая) мова — англійская. Другія мовы — найбольш распаўсюджаныя еўрапейскія мовы: іспанская, нямецкая, французская. Ужо некалькі гадоў студэнты факультэта вывучаюць у якасці другой мовы кітайскую, што павышае іх канкурэнтаздольнасць у бізнес-сферы Беларусі. У якасці факультатыўнай (трэцяй) замежнай мовы ўведзены турэцкая і персідская. На факультэце выкладаюць дзевяць замежных спецыялістаў з розных краін — гэта значыць, студэнты маюць магчымасць вывучаць мовы непасрэдна з іх носьбітамі.

Таксама намі праводзіцца карпаратыўнае навучанне замежным мовам на шэрагу беларускіх прадпрыемстваў. Курсы карыстаюцца вялікай папулярнасцю, паколькі іх праграма прадугледжвае навучанне не толькі мовам, але і навыкам бізнес-камунікацый з замежнымі партнёрамі.

Акрамя таго, у гэтым вучэбным годзе на базе Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі эканамічных кадраў БДЭУ адкрываецца спецыяльнасць «Камунікацыя ў сферы знешнеэканамічнай дзейнасці». Мы хочам даць магчымасць студэнтам і выпускнікам ВНУ Беларусі атрымаць глыбокія веды як у галіне дзелавой і міжкультурнай камунікацыі, так і ў галіне эканамічных навук.

***— Якая існуе методыка навучання бізнес-тэхналогіям?***

— Мы практыкуем акордавае запрашэнне вядучых спецыялістаў для чытання лекцый студэнтам факультэта. На базе факультэта праводзяцца майстар-класы вядучых навукоўцамі з Расіі, Украіны, Турцыі, Ірана, Кітая, Венесуэлы. Збіраемся ў далейшым яшчэ больш актыўна практыкаваць такі від працы, бо сёння ў сферы бізнес-камунікацый вялікая ўвага надаецца мадэляванню маўленчага ўздзеяння. Працадаўцамі асабліва цэняцца такія якасці і навыкі спецыялістаў па знешнеэканамічных сувязях, як уменне правільна наладжваць перагаворны працэс. Наш выпускнік — спецыяліст і па эфектыўнай камунікацыі ў сферы маркетынгу, і па арганізацыі кіравання знешнеэканамічнай дзейнасцю.

***— А на якіх прадпрыемствах працуюць вашы выпускнікі?***

— Дастаткова сказаць, што большасць выпускнікоў працуе ў аддзелах знешнеэканамічных сувязяў у якасці вядучых спецыялістаў, рэферэнтаў-перакладчыкаў, спецыялістаў па рэкламе і сувязях з грамадскасцю на БелАЗе, МАЗе, ММЗ ім. Вавілава, у Белзамежбудзе, НДЭІ Міністэрства эканомікі Беларусі.

**Мікалай ЛЕАНЧУК.**

**«ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ»**

**ВЫ МОЖЕТЕ УЖЕ СТАТЬ СТУДЕНТОМ.**
**Открыт приём на заочную форму обучения.**

**ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ**
**по передовым дистанционным и классическим технологиям**

- **ЮРИСПРУДЕНЦИЯ (специализации: гражданско-правовая, уголовно-правовая);**
- **ФИНАНСЫ И КРЕДИТ;**
- **БУХГАЛТЕРСКИЙ УЧЁТ, АНАЛИЗ И АУДИТ;**
- **ЭКОНОМИКА ОРГАНИЗАЦИИ (предприятия);**
- **МЕНЕДЖМЕНТ ОРГАНИЗАЦИИ;**
- **ЛОГИСТИКА.**

- Сроки обучения:
  - **3 года** на базе среднего специального профильного (техникум, колледж) и высшего образования (вступительные испытания – внутреннее собеседование в ВУЗе);
  - **5 лет** на базе среднего образования (вступительные испытания – внутреннее тестирование в ВУЗе);
- Обеспечение студентов-заочников общежитием;
- Доступная стоимость обучения;
- Выпускники ВУЗов получают **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ**;
- Приём документов и обучение по потокам: 2-ой до 25 июня, 3-ий до 25 августа.



О порядке поступления и обучения – официально в «ВПО ПРОФКОНСУЛЬТАНТ», 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А»,
тел.: (017) **200-82-57, 200-63-51**
GSM **(029) 509-82-57, (044) 709-82-57**
**www.vpo.by**
УНН 191170822
Свидетельство о государственной регистрации № 191170822 от 26.05.2009 г. Мингорисполкома.

## ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АГРАРНО–ЭКОНОМИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

## УСЛОВИЯ ПРИЕМА

**ДНЕВНОЕ ОТДЕЛЕНИЕ**

*Специальности на основе базового образования (9 классов):*

**(на бюджетной основе)**

➢ **«Бухгалтерский учет, анализ и контроль»** (квалификация – бухгалтер). Срок обучения – 2 года 10 месяцев. Вступительные испытания: русский (белорусский) язык – диктант, математика – письменно.

➢ **«Программное обеспечение информационных технологий»** (квалификация – техник-программист). Срок обучения – 3 года 10 месяцев. Вступительные испытания: русский (белорусский) язык – диктант, математика – письменно.

**(на платной основе)**

➢ **«Бухгалтерский учет, анализ и контроль»** (квалификация – бухгалтер). Срок обучения – 2 года 10 месяцев. **Без вступительных испытаний:** по конкурсу среднего балла документа об образовании.

➢ **«Программное обеспечение информационных технологий»** (квалификация – техник-программист). Срок обучения – 3 года 10 месяцев. **Без вступительных испытаний:** по конкурсу среднего балла документа об образовании.

*Подготовительные курсы будут организованы в июле 2013 г. Предварительная запись по тел. 8 0232 74 18 34 с 1 июня.*

*Специальности на основе общего среднего образования (11 классов):*

**(на бюджетной и платной основе)**

➢ **«Бухгалтерский учет, анализ и контроль»** (квалификация – бухгалтер). Срок обучения – 1 год 10 месяцев. **Без вступительных испытаний:** по конкурсу среднего балла документа об образовании.

➢ **«Экономика и организация производства»** (квалификация – техник-экономист). Срок обучения – 1 год 10 месяцев. **Без вступительных испытаний:** по конкурсу среднего балла документа об образовании.

**ЗАОЧНОЕ ОТДЕЛЕНИЕ**

**(на бюджетной основе и платной основе)**

*Специальности на основе общего среднего образования:*

➢ **«Бухгалтерский учет, анализ и контроль»** (квалификация – бухгалтер). Срок обучения – 2 года 9 месяцев. **Без вступительных испытаний:** по конкурсу среднего балла документа об образовании.

**ПРИЕМ ЗАЯВЛЕНИЙ:**

**на дневное обучение**
на основе базового образования с 15 июля по 29 июля;
на основе общего среднего образования с 15 июля по 8 августа;
на заочное обучение с 15 июля по 8 августа.

**На обучение на условиях оплаты: по 14 августа.**

**ВСТУПИТЕЛЬНЫЕ ЭКЗАМЕНЫ**

**На дневное обучение:**
на основе базового образования с 30 июля по 8 августа, зачисление 13 августа;
**на основе среднего образования** зачисление 13 августа.
**На заочное обучение** зачисление 13 августа.
**Зачисление на условиях оплаты:** по 16 августа.

Адрес: **246050, г. Гомель, ул. Пролетарская, д. 39.**
Тел. приемной комиссии: **8 0232 741834.**
Сайт: **ggaek.edu.by.**

УНП 400232033


# «Я Ў АГРАРЫІ ПАЙДУ...»

**Па службовых справах нам неаднойчы даводзілася (і даводзіцца цяпер) бываць у КСУПах і СВК Гомельшчыны, і рэдка абыходзіцца без таго, каб мы не сустракалі там выпускнікоў Гомельскага сельскагаспадарчага тэхнікума ці Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа, работнікаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй: бухгалтараў, планавікоў, юрыстаў. І што характэрна, яны з цеплынёй успамінаюць пра гады вучобы ў гэтай навучальнай установе і выказваюць падзяку яе педагагічнаму калектыву, які дапамог ім набыць веды ў галіне агульнаадукацыйных, эканамічных, тэхнічных і ўліковых дысцыплін, аказаў падтрымку ў складаных жыццёвых сітуацыях.**

І калі мы сказалі пра гэта дырэктару названай установы Аляксандру Васільевічу Бічану, той толькі заўважыў: усё заканамерна. Бо каледж, па сутнасці, з'яўляецца адной з першых сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў аграпрамысловага профілю, створаных пасля Вялікай Айчыннай вайны (1947). І «прайшоў ён дарогу» ў свой час як дзяржаўная сельскагаспадарчая школа па падрыхтоўцы кіруючых кадраў калгасаў з двух- і трохгадовым курсам навучання і як сельгастэхнікум (1956 год). За перыяд свайго існавання тут падрыхтавана больш як дваццаць тысяч спецыялістаў, якія працуюць на розных прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу краіны. У іх ліку і кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, галоўныя бухгалтары і эканамісты, навуковыя работнікі і выкладчыкі, якія пасля атрымалі вышэйшую адукацыю.

Падрыхтоўка спецыялістаў у каледжы на дзённым аддзяленні вядзецца па трох напрамках: «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль», «Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» і «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій», а на завочным — «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і кантроль». Сіламі педагагічнага калектыву (а гэта — сплаў маладосці і сталасці) будучыя спецыялісты атрымліваюць тэарэтычныя веды і выпрацоўваюць у каледжы практычныя навыкі, якія дазваляюць ім свабодна канкурыраваць ва ўмовах рынкавай эканомікі.

На працягу ўсёй вучобы з навучэнцамі працуюць сацыяльна-педагагічная служба і куратары, якія дапамагаюць ім адаптавацца ў калектыве. У каледжы чатыры сучасныя камп'ютарныя класы, дзе вядзецца навучальны працэс і юнакі і дзяўчаты далучаюцца да найноўшых інфармацыйных тэхналогій. Працуе бібліятэка з электроннымі носьбітамі інфармацыі, дзе рэгулярна праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі адміністрацый горада, раёнаў, падатковых інспекцый, банкаў, ДАІ і г.д.

Цікава праходзіць і пазаўрочная дзейнасць навучэнцаў. Для развіцця іх творчых здольнасцяў працуюць гурткі: вакальны, танцавальны, літаратурны, эстрадны, прыкладнога мастацтва. Умацаванню здароўя садзейнічаюць не толькі заняткі ў спартыўнай зале, але і круглагадовыя спартакіяды, рыцарскія турніры, дні здароўя.

У цэнтры горада маецца добраўпарадкаваны інтэрнат, які выдзяляецца ўсім іншагароднім. Там ёсць камп'ютарны клас з выхадам у інтэрнэт, трэнажорная зала, памяшканні для заняткаў дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам. Адным словам, паўнакроўным жыццём жывуць навучэнцы Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа.

# ЗАМЕЖНЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ ЗАВАБЛІВАЮЦЬ РУБЛЁМ

Згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 10 мая № 362 «Аб некаторых пытаннях прыцягнення замежных спецыялістаў да рэалізацыі адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі», стаўка пагадзіннай аплаты працы замежных спецыялістаў можа дасягаць памеру да 300% тарыфнай стаўкі першага разраду. На такую аплату працы могуць разлічваць іншаземныя спецыялісты, якія маюць дасягненні ў канкрэтнай сферы дзейнасці, валодаюць ведамі, метадамі і тэхналогіямі інавацыйнага характару для адпаведных профіляў (кірункаў) адукацыі і якія прыцягваюцца да ўдзелу ў рэалізацыі адукацыйных праграм установамі вышэйшай адукацыі, што фінансуюцца з рэспубліканскага бюджэту. Канкрэтны памер стаўкі пагадзіннай аплаты працы будзе вызначацца кіраўніком установы вышэйшай адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


*Учреждение образования*

**«МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ АВИАЦИОННЫЙ КОЛЛЕДЖ»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС**

**на замещение вакантных должностей профессорско-преподавательского состава по кафедрам:**

1. **Кафедра «Техническая эксплуатация радиоэлектронного оборудования»:**
   - заведующий кафедрой – 1;
   - доцент – 2;
   - старший преподаватель – 3.
2. **Кафедра «Техническая эксплуатация авиационного оборудования»:**
   - старший преподаватель – 1.
3. **Кафедра «Техническая эксплуатация воздушных судов и двигателей»:**
   - заведующий кафедрой – 1;
   - доцент – 1;
   - старший преподаватель – 1.
4. **Кафедра «Естественнонаучные дисциплины»**
   - профессор – 1;
   - преподаватель – 1.
5. **Кафедра «Физическое воспитание и спорт»:**
   - старший преподаватель – 1.
6. **Кафедра «Безопасность на воздушном транспорте»:**
   - старший преподаватель – 1;
   - преподаватель – 1.
7. **Кафедра «Английский язык»:**
   - заведующий кафедрой – 1;
   - старший преподаватель – 3.

Желающим подать заявку на участие в конкурсе нужно обратиться в УО «Минский государственный высший авиационный колледж» по адресу:
**220096, г. Минск, ул. Уборевича, 77.**
Срок подачи документов до 30.06.2013 года.
**Телефон для справок: (017) 345 14 42.**

УНП 100005688



## Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

## ПАРАДАК ПРЫЁМУ Ў БрДУ імя А.С. Пушкіна НА 2013 ГОД

Умовы і парадак прыёму абітурыентаў на дзённую і завочную формы атрымання вышэйшай адукацыі ва ўстанову адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» вызначаюцца Правіламі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, за-цверджанымі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2006 № 80. Універсітэт мае спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на права ажыццяўлення адукацыйнай дзейнасці № 02100/437, выдадзены Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь

### Тэрміны прыёму дакументаў

| | на дзённую форму атрымання адукацыі | на завочную форму атрымання адукацыі (поўны і скарочаны тэрміны навучання) |
|---|---|---|
| за кошт сродкаў бюджэту | з 16.07.2013 па 25.07.2013 | з 16.07.2013 па 25.07.2013<br>па 02.08.2013* |
| на ўмовах аплаты | з 16.07.2013 па 25.07.2013**<br>з 16.07.2013 па 04.08.2013 | з 16.07.2013 па 25.07.2013**<br>з 16.07.2013 па 04.08.2013 |

* - для асоб, якія вытрымалі ўступныя іспыты, але не прайшлі ў БрДУ імя А.С.Пушкіна па конкурсе на дзённую бюджэтную форму атрымання адукацыі
** - для абітурыентаў, якія будуць здаваць уступныя іспыты ў БрДУ імя А.С.Пушкіна

### Увазе абітурыентаў 2013 года!

Пры паступленні на спецыяльнасці **«Правазнаўства»**, **«Журналістыка»** у абавязковым парадку з 5 па 31 сакавіка 2013 неабходна зарэгістравацца на праходжанне прафесійна-псіхалагічнай гутаркі (тэсціравання) і прайсці яе з 5 па 30 красавіка.

Абітурыенты, якія здаюць уступныя іспыты па фізічнай культуры, да пачатку экзаменаў праходзяць дадатковы медыцынскі агляд ва ўстанове аховы здароўя **«Брэсцкі абласны дыспансер спартыўнай медыцыны»** па накіраванні прыёмнай камісіі ўніверсітэта.

БрДУ імя А.С. Пушкіна праводзіць **рэпетыцыйнае тэсціраванне** па матэрыялах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Даведкі па тэлефоне **(0162) 21 13 65.**

Інфармацыю аб **падрыхтоўчых курсах і падрыхтоўчым аддзяленні** ў 2012-2013 навучальным годзе можна даведацца па тэлефоне **(0162) 21 13 65.**

### Тэрміны правядзення ўступных іспытаў у БрДУ

**з 26.07.2013 па 30.07.2013**

### Тэрміны залічэння абітурыентаў

| | |
|---|---|
| па 01.08.2013 | за кошт сродкаў бюджэту на дзённую форму атрымання адукацыі |
| па 03.08.2013 | за кошт сродкаў бюджэту на завочную форму атрымання адукацыі (поўны і скарочаны тэрміны навучання) |
| па 06.08.2013 | на ўмовах аплаты на дзённую і завочную (поўны і скарочаны тэрміны навучання) формы атрымання адукацыі |

**Наш адрас:** 224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21
**Тэлефон:** (0162) 23-04-17 – прыёмная камісія
**Факс:** (0162) 23-09-96
**Web-сайт:** http://www.brsu.by
**E-mail:** selcom@brsu.brest.by (прыёмная камісія)

### Умоўныя абазначэнні

1 беларуская (Б) або руская мова (Р) (ЦТ)
2 фізіка (ЦТ)
3 матэматыка (ЦТ)
4 англійская мова (ЦТ)
5 нямецкая мова (ЦТ)
6 хімія (ЦТ)
7 біялогія (ЦТ)
8 геаграфія (ЦТ)
9 гісторыя Беларусі (ЦТ)
10 сусветная гісторыя навейшага часу (ЦТ)
11 беларуская літаратура (вусна)
12 руская літаратура (вусна)
13 творчасць
14 фізічная культура
15 грамадазнаўства (ЦТ)
16 экскурсазнаўства (пісьм.)
17 арганізацыя турызму (пісьм.)
ППГ прафесійна-псіхалагічная гутарка

### Факультэт фізічнага выхавання

| | |
|---|---|
| Фізічная культура (Д,З) | 1 7 14 |
| Фізічная культура (З) (3,5 года) | 1 7 14 |

### Псіхолага-педагагічны факультэт

| | |
|---|---|
| Пачатковая адукацыя (Д,З) | 1 9 3 |
| Псіхалогія (Д, З) | |
| Выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы (Д) | 1 9 13 |
| Пачатковая адукацыя (З) (3,5 года) | 1 9 3 |

### Геаграфічны факультэт

| | |
|---|---|
| Біялогія і геаграфія (Д, З) | 1 7 8 |
| Турызм і гасціннасць (Д, З) | 1 3 8 |
| Геаграфія (навукова-педагагічная дзейнасць) (Д) | 1 3 8 |
| Турызм і гасціннасць (З) (3,5 года) | 1 16 17 |

### Юрыдычны факультэт

| | |
|---|---|
| Правазнаўства (Д, З) | ППС 1 3 15 |
| Бізнес-адміністраванне (Д, З) | 1 4-5 3 |
| Правазнаўства * (З) (4 года) | ППС 1 3 15 |
| Бізнес-адміністраванне (3,5 года) (З) | 1 4-5 3 |

(З) - **завочная** форма
(Д) - **дзённая** форма
(Д,З) - **дзённая і завочная**
* - платнае навучанне

### Фізіка-матэматычны факультэт

| | |
|---|---|
| Матэматыка і інфарматыка (Д, З) | 1 2 3 |
| Матэматыка (навукова-педагагічная дзейнасць) (Д) | 1 2 3 |
| Фізіка (навукова-педагагічная дзейнасць) (Д) | 1 3 2 |
| Фізіка і інфарматыка | 1 3 2 |
| Прыкладная матэматыка (навукова-вытворчая дзейнасць) (Д) | 1 2 3 |
| Эканамічная кібернетыка (матэматычныя метады і камп'ютарнае мадэляванне ў эканоміцы) (Д) | 1 2 3 |

### Біялагічны факультэт

| | |
|---|---|
| Біяэкалогія (Д, З) | 1 6 7 |
| Біялогія і хімія (Д) | 1 6 7 |
| Біялогія (навукова-педагагічная дзейнасць) (Д, З) | 1 6 7 |
| Тэхналогія захоўвання і перапрацоўкі жывёльнай сыравіны * (Д, З) | 1 3 6 |
| Вытворчасць прадукцыі і арганізацыя грамадскага харчавання * (Д, З) | 1 3 6 |

### Факультэт замежных моў

| | |
|---|---|
| Англійская мова. Нямецкая мова (Д) | 1 9 4 |
| Нямецкая мова. Англійская мова (Д) | 1 9 5 |
| Сучасныя замежныя (англійская, нямецкая) мовы (выкладанне) (Д) | 1 9 4 |
| Сучасныя замежныя (нямецкая, англійская) мовы (выкладанне) (Д) | 1 9 5 |

### Гістарычны факультэт

| | |
|---|---|
| Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны (Д, З) | 1 9 10 |
| Гісторыя (рэлігія) | 1 9 10 |

### Філалагічны факультэт

| | |
|---|---|
| Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць) (Д) | Б 9 11 |
| Руская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць) (Д) | Р 9 12 |
| Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (Д) | Б 4 11 |
| Журналістыка (друкаваныя сродкі масавай інфармацыі) (Д, З) | ППС 1 9 13 |
| Беларуская мова і літаратура (З) | Б 9 11 |
| Руская мова і літаратура (З) | Р 9 12 |

### Сацыяльна-педагагічны факультэт

| | |
|---|---|
| Дашкольная адукацыя (Д, З) | 1 9 7 |
| Практычная псіхалогія (Д, З) | 1 9 7 |
| Сацыяльная работа (сацыяльна-педагагічная дзейнасць) (Д, З) | 1 9 7 |
| Сацыяльная работа (сацыяльна-псіхалагічная дзейнасць) (Д, З) | 1 9 7 |
| Дашкольная адукацыя (3,5 года) (З) | 1 9 7 |

УНП 200050321

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
30 05 2013 г.

«Залатыя» дзяўчаты

# ЧАМУ МАТЭМАТЫКА — НЕ ЖАНОЧАЯ ДЫСЦЫПЛІНА?



**Для значнай колькасці школьнікаў слова «матэматыка» — як гаркавая пілюля, ад якой перасмыкае ўсё цела. Але толькі не для такіх... паненак, як вучаніцы Ліцэя БДУ Лізавета ДАЎГЯЛА *(злева)* і Варвара КУЗЬМІЦКАЯ, якія сталі пераможцамі сёлетняй Еўрапейскай матэматычнай алімпіяды сярод дзяўчат.**



## ЯК НАШЫ ЛЮКСЕМБУРГ СКАРАЛІ

***— Як вы ўспрынялі сваё вылучэнне на алімпіяду?***

**Варвара** (*усміхаецца і паціскае плячыма*): Нам проста сказалі, што мы ўдзельнічаем, і папрасілі прынесці пашпартныя даныя.

***— А як рыхтаваліся да спаборніцтваў?***

**Лізавета:** З намі ў Ліцэі пастаянна займаюцца педагогі (*Лізавета вучыцца ў фізіка-матэматычным класе.* — **Аўт.**), напрыклад, Міхаіл Васільевіч Карпук, які выкладае ў мяне алгебру, быў нашым кіраўніком каманды падчас алімпіяды. Акрамя звычайных заняткаў, у нас ёсць спецкурс па рашэнні алімпіядных задач, які вядзе Ігар Іванавіч Варановіч. Бывае, мы нават сядзім з раніцы да вечара і рашаем задачы. Падрыхтоўка на курсе ідзе пастаянна, кожную суботу, а часам і некалькі разоў сярод тыдня.

**— З якімі думкамі ехалі на алімпіяду?**

**Лізавета:** Мне было вельмі цікава паспрабаваць свае сілы на алімпіядзе такога ўзроўню. Ды і сама магчымасць паглядзець на іншую краіну прываблівала. У нас былі экскурсіі, прагулкі па горадзе, знаёмствы з новымі людзьмі.

**Варвара:** Я дагэтуль ніколі не ўдзельнічала ў алімпіядах міжнароднага ўзроўню, і мне падавалася, што я «напішу» гэту алімпіяду зусім дрэнна.

**— Складана было?**

**Лізавета:** Праграма была такая, што цягам двух дзён за 4,5 гадзіны мы рашалі па тры задачы. Калі «пішаш алімпіяду», заўжды падаецца, што ўсё складана. Ды і насамрэч задачы былі даволі складанымі — усё ж гэта міжнародны ўзровень.

***— Якія ў вас былі пачуцці, калі даведаліся, што сталі пераможцамі?***

**Варвара** (*усміхаецца*): Гэта было нечакана і, зразумела, радасна.

**Лізавета:** І было вельмі прыемна чуць на цырымоніі ўзнагароджання, як усе казалі пра Беларусь. Бо мы падзялілі першае каманднае месца з Сербіяй і ЗША па сумарнай колькасці балаў (*каманда з Беларусі набрала 99 балаў, але ў асабістым заліку ў нашых дзяўчат было тры «золата», а ў іх бліжэйшых саперніц — па адным.* — **Аўт.**), таму наш поспех усе абмяркоўвалі.

***— А што больш за ўсё ўразіла і запомнілася падчас паездкі ды іспытаў?***

**Варвара:** Мяне вельмі здзівіла працэдура падачы апеляцыі пасля алімпіяды. У нас мы самі ідзём падаваць апеляцыю, а там гэта рабілі кіраўнікі каманд.

**Лізавета:** Мы мелі стасункі з дзяўчатамі з іншых каманд. Нас сялілі ў пакоі па шэсць чалавек, прычым, у кожным пакоі было па дзве дзяўчынкі з трох розных краін. Было цікава!

## У ГЭТАЙ НАВУКІ — СВАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

***— Вас не здзівіў фармат алімпіяды — яна праводзілася выключна сярод дзяўчат?..***

**Лізавета:** Так, гэта рэдкасць, калі такія спаборніцтвы праходзяць толькі сярод дзяўчат альбо сярод хлопцаў. Раней мы ўдзельнічалі і ў іншых алімпіядах (напрыклад, рэспубліканскіх), дзе былі і хлопцы, і дзяўчаты. Але гэта было цікава, бо нашы саперніцы былі з іншых краін.

***— А як вы ставіцеся да такога меркавання, што хлопцы больш за дзяўчат здольныя да дакладных навук?***

**Варвара:** Мне падаецца, што проста ў спаборніцтвах па дакладных дысцыплінах хлопцаў выступае больш. Але калі ў іх бяруць удзел дзяўчаты, яны звычайна паказваюць не горшыя вынікі.

**Варвара:** Я займаюся праграмаваннем, а таксама люблю чытаць кнігі. Чытаю шмат розных твораў, але найбольш люблю фантастыку.

**Лізавета:** Я таксама люблю чытаць мастацкую літаратуру і, вядома ж, літаратуру па матэматыцы (*усміхаецца*). Захапляюся яздой на веласіпедзе, вельмі люблю жывёл. Часам — пішу вершы. (*Дарэчы, дзяўчаты сваімі прыкладамі абвяргаюць яшчэ адзін распаўсюджаны міф — быццам бы матэматыкі слабыя ў гуманітарных дысцыплінах. Абедзве ліцэісткі маюць сярэдні бал паспяховасці вышэйшы за дзевяць.* — **Аўт.**)

***— А якія планы наконт будучай прафесіі?***

**Насамрэч матэматыка — вельмі цікавая навука. Там усё дакладна і адназначна, усё можна строга даказаць, і ў гэтым ёсць свая прыгажосць.**



**ДАВЕДКА**
**Алімпіяда European Girls' Mathematical Olympiad праводзілася ўжо ў другі раз. Сёлета спаборніцтвы праходзілі ў Люксембургу. Каманда з Беларусі ўдзельнічала ў іх упершыню. І з першага ж разу нашы дзяўчаты паказалі бліскучы вынік, заваяваўшы першае каманднае месца сярод 22 краін-удзельніц, а таксама тры залатыя і адзін бронзавы медалі. Акрамя Лізаветы Даўгялы і Варвары Кузьміцкай залатую ўзнагароду атрымала навучэнка бабруйскай гімназіі № 3 Настасся Жыркевіч, а «бронзу» ўзяла прадстаўніца мінскай гімназіі № 4 Ірына Бурак.**

***— Дзяўчаты, а ўвогуле, што вас захапляе ў матэматыцы?***

**Лізавета:** Насамрэч матэматыка — вельмі цікавая навука. Там усё дакладна і адназначна, усё можна строга даказаць, і ў гэтым ёсць свая прыгажосць. Ёсць меркаванне, што матэматыкі — гэта сухія па натуры людзі, якія нічым не цікавяцца. Але яно не адпавядае рэчаіснасці, у іх, як і ва ўсіх людзей, бываюць розныя іншыя захапленні.

**Варвара:** У матэматыцы ўсё вынікае з пэўных фактаў. Такая дакладнасць ёсць не ва ўсіх дысцыплінах. Асабіста для мяне матэматыка прасцейшая за ўсё астатняе. Мне лягчэй нешта самой даказаць, чым вывучыць параграф па геаграфіі ці біялогіі, хоць з гэтымі прадметамі ў мяне праблем таксама няма.

## У ЧЫМ НАТХНЕННЕ ДЛЯ МАТЭМАТЫКАЎ

***— А ёсць у вас якія-небудзь «нематэматычныя» захапленні?***

**Лізавета:** Я заканчваю 11 клас, але да канца яшчэ не вызначылася, куды буду паступаць. Ведаю толькі, што мой выбар дакладна будзе звязаны з матэматыкай. Я ўдзельнічала ў рэспубліканскай алімпіядзе, і гэта дае мне права паступлення на матэматычныя факультэты без здачы ЦТ. Таму застаецца толькі зрабіць выбар.

**Варвара:** У мяне наперадзе яшчэ год вучобы, але паколькі я захапляюся праграмаваннем, то думаю, што мая прафесія будзе звязана менавіта з гэтай сферай дзейнасці. Магчыма, дзяўчатам-праграмістам крыху цяжкавата, бо ўсе звыкліся, што гэта мужчынская прафесія. З іншага боку, у мяне ёсць знаёмыя дзяўчаты больш спрытныя ў праграмаванні, чым хлопцы.

***— І апошняе пытанне. Што вас натхняе?***

**Дзяўчаты** (*задумваюцца і разам фармулююць адказ*): Жыць і не імкнуцца ні да чаго — гэта неяк дзіўна. Жыць цікава, калі ёсць мэта.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

# «КАНСКІЯ ЛЬВЫ»...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

**— І ёсць попыт на такіх спецыялістаў у Беларусі?**

— Безумоўна! Напрыклад, я зараз працую ў адным з беларускіх рэкламных агенцтваў. Дарэчы, трэба падзякаваць майму ўніверсітэту яшчэ і за тое, што працаваць нікому не замінаюць. Наадварот, тут заахвочваюць быць ініцыятыўнымі. На любое мерапрыемства (напрыклад, канферэнцыю), звязанае з вучобай, адпускаюць без лішніх пытанняў.

Што датычыць беларускай сітуацыі, то, як кажуць, «хто першы ўстаў, таго і тапкі». Зараз сфера электроннага маркетынгу развіваецца неверагодна хуткімі тэмпамі менавіта тут, у нас. Тым больш што ад нашых суседзяў мы моцна адстаём. І кожная кампанія хоча максімальна хутка заняць сваё месца. Спецыялісты — нарасхват. Людзі ва ўзросце да 25 гадоў ужо больш часу праводзяць у сеціве, чым за праглядам тэлебачання. Там наша будучыня.

**— А за што ты атрымаў прыз ад пасла Вялікабрытаніі? Няўжо за свае прафесійныя поспехі?**

— Так, бо адзін з відаў маёй працы — гэта сацыяльная рэклама. Грант мне далі за праект па ліквідацыі фінансавай няграматнасці ў Беларусі. Рыхтаваў я яго для іншага беларускага фестывалю, які называецца «Белы квадрат». Але на радзіме яго спачатку не заўважылі. Затое потым праект заняў высокія месцы на конкурсах у Маскве, Кіеве, Новасібірску. Ну і, нарэшце, здабыў перамогу на «Энергіі поспеху-2012» у Мінску.

Сутнасць праекта, як я ўжо сказаў, у фінансавай адукацыі насельніцтва краіны. Менавіта па гэтым паказчыку беларусы моцна адстаюць ад жыхароў іншых еўрапейскіх дзяржаў. Падчас падзей, што адбываліся з беларускай эканомікай у 2011 годзе, многія людзі сталі ахвярамі фінансавага махлярства некаторых банкаў. Напрыклад, рабілі ўклады пад вялікія працэнтныя стаўкі, не чытаючы ўвесь дагавор. Не заўважалі «тое, што напісана маленькімі літаркамі». Вырашэнню гэтай праблемы і быў прысвечаны мой праект пад назвай «Народны банк».

**Сфера электроннага маркетынгу развіваецца неверагодна хуткімі тэмпамі менавіта тут, у нас. Тым больш што ад нашых суседзяў мы моцна адстаём. І кожная кампанія хоча максімальна хутка заняць сваё месца. Спецыялісты — нарасхват.**

Грант у 3 тысячы фунтаў стэрлінгаў на навучанне ў ВНУ з доўгай назвай Магна Карта Коледж Оксфард быў прызам ад спонсараў конкурсу. Яго я атрымаў з рук Бруса Бакнэла, пасла Вялікабрытаніі ў Беларусі.

**— Збіраешся працягваць удзел у падобных конкурсах?**

— Ужо працягваю. Больш за тое: ёсць яшчэ адна маленькая перамога. У чэрвені, падчас буйнейшага ў свеце фестывалю рэкламы і маркетынгу «Канскія львы» для маладых рэкламшчыкаў з усяго свету працуюць курсы пад назвай Roger Hatchuel Academy. У гэтым годзе ўпершыню адно месца на гэтых курсах выдзелілі для Беларусі. Я даслаў арганізатарам сваё рэзюмэ — і вось ужо збіраюся ў вандроўку.

**— Што ты параіў бы выбраць сёлетнім абітурыентам: перспектыўную для кар'еры спецыяльнасць альбо тое месца, куды «цягне»?**

— У маім выпадку гэтыя месцы супалі. Дакладна не ведаю адказ на тваё пытанне, але мне здаецца, усё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі. Напрыклад, калі ты ведаеш, што без вялікіх грошай тваё жыццё будзе складаным, можна ахвяраваць асабістымі інтарэсамі. Але ў мяне ёсць яскравы прыклад — мой сябра, які паступіў у тэхнічную ВНУ проста для таго, каб стаць студэнтам. Але ўжо на першым курсе яго пакуты сталі нясцерпнымі. І ён перавёўся на абсалютна супрацьлеглую гуманітарную спецыяльнасць. Дарэчы, зараз робіць сабе паспяховую кар'еру менавіта па новай спецыяльнасці.

**— Ці адпавядаюць беларускія ўніверсітэты сучасным рэаліям?**



— Праблема не ва ўніверсітэтах. У нас добрыя, моцныя ВНУ, якія якасна выконваюць сваю працу. Праблема ў студэнтах: многа нематываваных студэнтаў, якім нічога нецікава. І ніякі ўніверсітэт не зможа абудзіць у іх жаданне вучыцца.

Я лічу, што задача любога ўніверсітэта — даць веды. І ўсё. Матывацыя, цікавасць, стараннасць — персанальная справа кожнага. Калі ўніверсітэт можа даць якасныя веды — яго функцыю можна лічыць выкананай.

**— А што асабіста ты лічыш студэнцкім шчасцем?**

— Студэнцкае шчасце — гэта зразумець падчас навучання, чым ты хочаш займацца ўсё жыццё.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

Конкурс «Новы погляд»

## ВЫНІКІ — У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

**Сёння мы друкуем апошнюю падборку творчых работ нашых юных нештатных аўтараў, якія літаральна напярэдадні заканчэння тэрмінаў прыёму паступілі на конкурс «Новы погляд». Цягам многіх месяцаў чытачы «Чырвонкі» мелі магчымасць азнаёміцца з «пробай пяра» юнакоў і дзяўчат з многіх куткоў нашай краіны, а самі пачаткоўцы — заявіць пра сябе ў новай якасці са старонак моладзевага выдання. На гэтым мы ставім...**

Не, не кропку. Вынікі конкурсу будуць агучаны ў наступным выпуску «Чырвонкі». Але і іх мы прапануем не лічыць кропкай у нашых узаемаадносінах з цяперашнімі (і, спадзяёмся, новымі) аўтарамі. Як ужо гаварылася, хаця гэты конкурс і скончаны, а новы — яшчэ не абвешчаны, мы заклікаем нашых юных карэспандэнтаў: пішыце, дасылайце ў рэдакцыю свае «пробы пяра»! Наперадзе — лета, якое дае магчымасць не толькі перажыць цудоўныя моманты ў жыцці, але і падзяліцца імі са старонак «Чырвонкі» з іншымі. Чакаем вашых допісаў! Самыя цікавыя абавязкова будуць надрукаваныя!

**Рэдакцыя «Чырвонкі».**

ІДЭІ МАЛАДЫХ

# ЯК ШКОЛЬНІКІ ПРЫМУСІЛІ СЯБЕ СЛУХАЦЬ

**Я і мае аднакласнікі вырашылі не марнаваць вольны ад вучобы час і знайшлі арыгінальны спосаб заняць сябе — знаёміць людзей з цікавай інфармацыяй пра сваю малую радзіму. Калі ў мінулым навучальным годзе ў Мінскай вобласці быў аб'яўлены конкурс інавацыйных ідэй навучэнскай моладзі, у нашай школе завärушыліся адразу. Падрабязна вывучылі палажэнне. Так і з'явілася ідэя стварэння... турыстычнага бізнесу.**

Прычым ідэя паўстала не на пустым месцы. Ужо чатыры гады запар у школе працуе перасоўны палатачны лагер «Задора», у сувязі з чым даволі вялікая колькасць дзяцей захапляецца турызмам. Для гэтых мэт за пазабюджэтныя сродкі школа набыла палаткі, спальныя мяшкі, прыстасаванні для распальвання вогнішча і іншы турыстычны інвентар, які можна паспяхова выкарыстоўваць у бізнес-праекце. У школе ёсць краязнаўчы музей імя В.П. Налецкага, дзе назапашана шмат матэрыялаў і экспанатаў. Аграгарадок Ракаў — прывабнае месца для турыстаў, якое вызначаецца шырокім спектрам культурна-гістарычных славутасцяў і блізкасцю да сталіцы.

За распрацоўку праекта ўзяліся экскурсаводы школьнага музея пад кіраўніцтвам настаўніка гісторыі Алены Валер'еўны Грыбоўскай. Я таксама з'яўляюся адным з экскурсаводаў. Намі было праведзена даследаванне «рынку», распрацаваны бізнес-план, праведзена маркетынгавая кампанія.

**Правядзенне экскурсій, несумненна, павысіла нашу самаацэнку. У нас з'явіўся досвед зносін з людзьмі розных узростаў, мы навучыліся слухаць і выказваць свае думкі, каб нас разумеў кожны.**

Канчатковы варыянт праекта адлюстраваўся ў праграме выхаднога дня «Ракава сівыя камяні». Ён быў адабраны ў фінал конкурсу інавацыйных ідэй навучэнскай моладзі і атрымаў дыпломы прыз аргкамітэта.

Сёння ў школьнай бізнес-кампаніі — шэсць чалавек. Акрамя ўдзелу ў дзейнасці самой бізнес-кампаніі, усе мы наведваем факультатыўныя заняткі па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці. Дзякуючы гэтаму дапрацавалі бізнес-план, дзе дэталёва распісана дзейнасць кампаніі і асаблівасці прапанаваных паслуг.

Экскурсія разлічана на групу да 30 чалавек. Можа быць аднадзённай ці двухдзённай, пешай ці веласіпеднай. Гасцям прапануем наведаць службу ў Спаса-Праабражэнскай царкве, паслухаць арганную музыку, паспытаць вады са святой крыніцы. Экскурсантам прапануем турыстычны абед на свежым паветры, удзел у фальклорных абрадах і спартыўных гульнях, а таксама выраб сувеніраў сваімі рукамі.

За перыяд існавання бізнес-кампаніі мы правялі шмат экскурсій — для Рэспубліканскага саюза жанчын, педагагічнага калектыву Мінскага абласнога ліцэя, наменскаў дырэктараў па выхаваўчай працы, для навучэнцаў розных школ Валожынскага раёна і жыхароў сталіцы.

Паралельна наша кампанія вырабляе сувенірную прадукцыю: лялькі і календары розных фарматаў.

У любое надвор'е — і ўлетку, і ўзімку — мы з радасцю прымаем новых гасцей, якія знаёмяцца са старадаўнімі вулачкамі, распавядаем ім легенды і паданні. Я звяртаю ўвагу на Спаса-Праабражэнскую царкву і не проста расказваю пра гісторыю будынка, а дзялюся сваімі ўласнымі ўражаннямі.

Калі азірнуцца назад і паглядзець на зробленую намі працу, часам проста дзівішся таму, як звычайныя школьнікі змаглі дабіцца такога. Правядзенне экскурсій, несумненна, павысіла нашу самаацэнку. У нас з'явіўся досвед зносін з людзьмі розных узростаў, мы навучыліся слухаць і выказваць свае думкі, каб нас разумеў кожны. Я завяла мноства знаёмстваў, даведалася шмат цікавага пра сваю малую радзіму. Быць экскурсаводам — несумненна, выдатны жыццёвы досвед. Пры вялікім жаданні кожны чалавек можа дамагчыся поспехаў у любой справе, у любым пачынанні.

**Кацярына ЗАБЕЛА, вучаніца 11 класа Ракаўскай сярэдняй школы Валожынскага раёна.**

## Пра аўтара

*Кацярына любіць чытаць замежную літаратуру, фатаграфаваць цікавыя пейзажы і падзеі. Складае вершы і невялікія аповеды, перараблівае песні на свой лад. З задавальненнем любіць глядзець фільмы савецкага часу і мюзіклы. А яшчэ спявае ў школьным і царкоўным хорах.*

*— У будучыні хачу стаць журналістам — збіраць цікавую інфармацыю, заводзіць новыя знаёмствы, пісаць пра палітычныя і спартыўныя падзеі ў свеце. Спадзяюся, што мая мара стане рэальнасцю, — кажа сама Кацярына. — Таксама хацела б займацца добраахвотнай дзейнасцю. Я лічу, што кожны, хто здольны дапамагчы іншым — матэрыяльна ці маральна, — не задумваючыся павінен гэта рабіць.*

КАБ ШТОДЗЕНЬ, УСЮДЫ!

# ТАКІЯ РОДНЫЯ-РОЗНЫЯ

**Хто мы? Беларусы? А хто гэта? Гаварыць, што — нацыя. А што такое нацыя? Гісторыкі сцвярджаюць, што гэта супольнасць людзей, якая склалася гістарычна і якая ўзнікла на базе агульнасці мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця і псіхалагічнага складу, што праяўляецца ў агульнасці культуры. Ці ёсць такая нацыя — беларусы?**

У нас жа ў наяўнасці ўсё: і агульнасць тэрыторыі, і агульнасць псіхалагічнага складу і эканамічнага жыцця. Аднак у нас амаль не засталося роднай мовы. Беларускай мовы, якая па мілагучнасці ў свеце займае другое месца пасля італьянскай!

Беларусы! Задумайцеся, наша мова можа знікнуць. Чаму? Хто адкажа на гэтае пытанне? А самае галоўнае, хто і як будзе яе «ратаваць»? Зараз рэдка сустрэнеш чалавека, які чыста і прыгожа размаўляе на роднай мове. Так, што аж дух займае! Можа, гэта таму, што яна, наша мова, «вясковая», непрыгожая?.. А можа, цяжкая, нам не родная? Мабыць, так яно і ёсць... Калі не, дык як растлумачыць, што мова тытульнай нацыі аказалася ў такім занядбанні? Нягледзячы на тое, што для большасці беларусаў роднай з'яўляецца менавіта беларуская мова (паводле апошняга перапісу насельніцтва), яны размаўляюць на рускай. Штодзень, усюды... Я не гавару аб тым, што рускую мову трэба забараніць ці хоць менш на ёй размаўляць. Руская мова ў нашай краіне мае тыя ж правы, што і беларуская. Але яна займае лідзіруючыя пазіцыі па выкарыстанні ва ўсіх сферах жыцця. Так склалася гістарычна. А як зрабіць так, каб беларуская і руская мова былі ў паўсядзённым ўжытку роўныя, аднолькавыя, раўнапраўныя? Мне здаецца, што трэба пачынаць з дзіцячага садка, са школы. У краіне большасць школ працуе на рускай мове. Але няўжо ж так цяжка навучаць школьнікаў на роднай? Менавіта з малых гадоў трэба вучыць дзяцей гісторыі роднага краю. Праз казкі, вершы, песні, гульні... У рэшце праз уласны прыклад — размаўляць на роднай мове заўжды і з усімі.

**Павел КАНАНОВІЧ, вучань 11 класа Маларыцкай раённай гімназіі.**

## Пра аўтара

*Паўлу 16 гадоў. Пасля школы ён марыць паступіць на журфак, бо юнаку, паводле яго слоў, вельмі падабаецца займацца працай журналіста. Яшчэ Павел піша вершы, песні — «падаецца, нядрэнна». Гэта збольшага, што аўтар палічыў неабходным паведаміць пра сябе рэдакцыі. «Не люблю шмат пра сябе гаварыць. Можа, калі сустрэнемся, тады і пагаворым».*

КАРАНІ

# КАРТА ЯГО ПАДАРОЖЖАЎ



**Часам мы не звяртаем асаблівай увагі на тых, хто працуе і жыве побач з намі. А людзі гэтыя па прычыне сціпласці не выпінаюцца наперад, а штодня робяць сваю справу, бездакорна і адмыслова. Гэтых людзей не назавеш знакамітымі. А ім гэта і не патрэбна! Але ж пры больш блізкім знаёмстве высвятляецца, што яны — цікавыя суразмоўцы, у іх крэатыўныя і сучасныя погляды на жыццё. Нягледзячы на ўзрост, у іх адчуваецца і жыццёвая мудрасць, і бачны моладзевы бляск у вачах. На шчасце, такіх людзей шмат. Узяць хаця б нашу Кальчунскую школу. Яна ў нас асаблівая. Ужо нават таму, што амаль палова настаўнікаў — мужчыны. Сёння, калі педагогіка мае пераважна «жаночы твар», не кожная ўстанова адукацыі можа пахваліцца такім складам.**

Я вырашыла пагутарыць з нашым настаўнікам Аляксандрам Вітольдавічам Навумчыкам, які працуе ў школе ўсяго толькі чатыры гады — выкладае геаграфію і гісторыю. Ён вельмі любіць падарожнічаць. Сваімі ўражаннямі заўсёды дзеліцца з намі. А яшчэ ён вучыць нас любіць свой край — праз добрыя ўчынкі і справы, праз сваё захапленне фатаграфаваннем.

**— Аляксандр Вітольдавіч, вы шчаслівы чалавек?**

— У кожнага сваё паняцце шчасця. Для мяне шчасце — гэта, як ні пафасна прагучыць, быць патрэбным там, дзе нарадзіўся. Мая Радзіма — невялікая вёска Кальчуны, якая мае славутую гісторыю і багатыя традыцыі. Тут мае карані, тут я вучыўся. Адсюль мая дарога пралягла ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, пасля заканчэння якога вярнуўся ў сцены роднай школы. У мяне ёсць любімая праца і вучні, зацікаўленыя ў вывучэнні майго прадмета. А яшчэ ў мяне ёсць надзейныя сябры, якія падтрымліваюць мяне ў хвіліны радасці і смутку, радуюцца маім перамогам.

**— Чаму вы звязалі сваю прафесійную дзейнасць менавіта з педагогікай?**

— Я лічу, што ў кожнага чалавека сваё кола жыцця. І ў дзяцінстве ў гэтым коле я выбраў тыя моманты, якія былі мне найбольш па душы, а затым уключыў іх у свае планы на будучае. Мая мара пачала ажыццяўляцца пасля паступлення ва ўніверсітэт. Вялікі ўплыў на мяне аказалі настаўнікі Антон Пятровіч Шмукста, Святлана Пятроўна Чарняк, Клаўдзія Макараўна Каляда, Таццяна Ягораўна Давідовіч, Ванда Браніславаўна Харэвіч. Менавіта яны сталі для мяне прыкладам чалавечнасці, дабрыні, павагі, чуласці і ў той жа час патрабавальнасці. Настаўнік адыгрывае вялікую ролю ў жыцці кожнага чалавека: ён разгортвае перад маленькім чалавекам «Буквар» і затым вядзе яго не толькі па краіне ведаў, але і па жыццёвых «старонках».

**— А чаму вы абралі для выкладання менавіта гісторыю і геаграфію? Чым захапілі вас гэтыя навукі?**

— Гісторыя і геаграфія — як дрэва: на паверхні толькі ствол ды крона, але, каб пазнаць цэлае, патрэбна дабрацца да каранёў, а затым данесці ўсё гэта дзецям. А яшчэ я вельмі люблю падарожнічаць, рабіць для сябе пэўныя адкрыцці і — здзіўляцца. Мы жывём да той пары, пакуль не страчваем менавіта гэтай дзіцячай здольнасці — здзіўляцца.

На карце маіх падарожжаў амаль усе куточкі Беларусі са знакамітымі мясцінамі і славутасцямі. Падарожнічаць я пачаў яшчэ ў школе. Ужо будучы настаўнікам, пабываў на Украіне, у Карпатах. Уражанні і эмоцыі ад горных вяршынь, якія прыйшлося пакарыць, перапаўняюць мяне і сёння. Падарожжы дапамагаюць мне больш якасна праводзіць урокі, бо я не проста даю вучням гістарычныя альбо геаграфічныя веды, а раблю гэта ў ракурсе падарожжа вачыма настаўніка. Такія ўрокі павялічваюць цікавасць да вывучэння прадмета.

**— Чым, акрамя падарожжаў, вы захапляецеся яшчэ?**

— У школе, дзе я працую, створаны ўсе ўмовы для таго, каб займацца фотасправай. Фатаграфаваць сёння могуць усе, аднак зрабіць здымак, які быў бы сапраўдным мастацтвам, умеюць толькі адзінкі.

Сярод маіх захапленняў — развядзенне экзатычных паўзуноў. У мяне дома ёсць два акварыумы, у якіх жывуць кітайскія чырванабрухія трытоны, чырванавухая чарапаха, дзве рыбы-змяі (калабарскія каламаіхты) і звычайныя акварыумныя рыбкі. Вось такія ў мяне хатнія «пастаяльцы».

**— Аб чым марыць малады настаўнік?**

— Аб падарожжах, бо часу не так і шмат. Гэта ўсяго толькі частка летніх канікулаў. Я мару пабываць у Аўстраліі. Спадзяюся, што гэта падарожжа будзе самым цікавым і захапляльным у маім жыцці. Чаму менавіта гэты кантынент? Аўстралія — гэта пустыня Вікторыя, салёныя азёры, толькі дзве пары года, дваццаць дзве тысячы відаў раслін і большасць млекакормячых — сумчатыя. Сярод славутасцяў Аўстраліі — нацыянальныя паркі. А яшчэ там кожны год праводзяцца гонкі «Формулы-1».

**— Якімі будуць вашы пажаданні мне, вучаніцы, якая ў хуткім часе паўстане перад выбарам прафесіі?**

— Неабходна ўважліва прааналізаваць, што больш па душы, якія здольнасці табе хацелася б развіваць далей. За апошнія гады вучобы ў школе неабходна па-новаму паглядзець на прадметы і накіраваць свае веды туды, да чаго ёсць вялікае жаданне і што лепш атрымліваецца. Правільна выбраная прафесія — гэта палова поспеху ў жыцці, а можа, і больш, таму выбар павінен быць абдуманым. Сёння моладзь імкнецца да прэстыжных спецыяльнасцяў і высокай зарплаты. Аднак гэта не самае галоўнае. Жыць па прынцыпе «сцерпіцца-злюбіцца» — гэта ж не жыць наогул. Жыццё кароткае, таму трэба пражыць яго так, каб і самому было цікава, каб чалавек мог адчуваць задавальненне ад таго, што робіць, і людзям каб была ад гэтага карысць.

**Інга ГІЗ, вучаніца 9 класа Кальчунскай сярэдняй школы Ашмянскага раёна.**

## Пра аўтара

*Інзе 15 гадоў. У 2011 годзе яна скончыла музычную школу па класе фартэпіяна. Дзяўчына кажа, што музыка ўздымае ёй настрой, дапамагае ісці па жыцці. Яшчэ Інга любіць маляваць. Прымае актыўны ўдзел у розных конкурсах і прадметных алімпіядах. Любіць урокі роднай мовы і літаратуры.*

*— Мая любоў да гэтых прадметаў праяўляецца не толькі ў выніках алімпіяд, але і ў вершах, замалёўках і нататках, — распавяла Інга. — Не ўяўляю свайго жыцця без кніг і перыядычных выданняў. Цікаўлюся часопісамі «Маладосць», «Полымя», дзе знаёмлюся з сучаснымі аўтарамі і іх творчасцю. Апошнім часам вельмі зацікавілася прафесіяй журналіста. Спрабую свае сілы ў школе маладога журналіста пры мясцовай «раёнцы», на старонках якой з'яўляюцца мае публікацыі.*

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.

№ 15 (473)



# ШЭСЦЬ ЗАХВОРВАННЯЎ РУЖ І СПОСАБЫ ІХ ЛЯЧЭННЯ

**Ружы ўражваюць сваёй прыгажосцю, але іх досыць складана даглядаць. Існуе мноства насякомых і захворванняў, якія могуць прынесці шкоду вашым ружам.**

1. НЯПРАВІЛЬНА СФАРМІРАВАНЫЯ ЦІ ЧЭЗЛЫЯ СЦЁБЛЫ

Гэта грыбковае захворванне, вядомае пад назвай сапраўднай мучністай расы. Пры гэтым захворванні лісце і сцёблы руж пакрыты белай пудрай, якая разносіцца ветрам. Лісты руж становяцца фіялетавымі і пачынаюць згортвацца. Для лячэння распыліце на лісце і сцёблы бенаміл (Benomyl) ці фунгінекс (Funginex).



2. ЧОРНЫЯ ПЛЯМЫ НА ЛІСЦІ

Пры гэтым захворванні на лісці руж з'яўляюцца чорныя круглыя плямы, якія маюць абрамленыя краі, якія выклікаюць пажаўценне лісця. Каб вылечыць ружы ад гэтага захворвання, неабходна сарваць усё пашкоджанае лісце, а таксама сабраць вакол расліны ўсё лісце, якое апала.

3. ЧЭЗЛАЕ ЦІ НЯПРАВІЛЬНА СФАРМІРАВАНАЕ ЛІСЦЕ ЦІ КВЕТКІ

Няправільна сфарміраванае лісце і кветкі могуць быць наступствам нападу клешчыкаў павуцінневых. Гэтыя кляшчы звычайна бываюць зялёна-чырвонага ці жоўтага колеру і размяшчаюцца на ніжняй частцы лісця, дзе ім зручней усяго высмоктваць сок з раслін. Каб пазбавіцца ад гэтых шкоднікаў, можаце скарыстацца ізатоксам (Isotox) ці артэнам (Orthene).

4. ПАКРЫТАЕ ПУЗЫРАМІ ЛІСЦЕ

Калі вы заўважыце, што на ніжнім баку лісця руж з'явіліся пузыры, гэта можа сведчыць пра захворванне, вядомае пад назвай "іржа". Пузыры могуць быць аранжава-чырвонага колеру, якія ўвосень набываюць чорны колер. Гэтае захворванне спакойна пераносіць зіму, а ўвесну, калі з'яўляюцца новыя парасткі, можа атакаваць і іх. Каб вылечыць расліну ад гэтага захворвання, збярыце ўсё пашкоджанае лісце з самай расліны і з зямлі. Распыляйце бенаміл (Benomyl) ці фунгінекс (Funginex) кожныя 7-10 дзён.

5. КВЕТКІ, ЯКІЯ НЯПРАВІЛЬНА СФАРМІРАВАНЫ ЦІ НЕ РАСПУСКАЮЦЦА

Прычынай гэтаму захворванню служаць жукі, якія называюцца трыпсы. Жукі бываюць карычнявата-жоўтага колеру з махрыстымі крыламі. Яны пашкоджваюць расліну, высмоктваючы сок з бутонаў. Каб пазбавіцца ад гэтых жукоў, давядзецца зразаць усе пашкоджаныя кветкі. Можаце таксама скарыстацца малаціёнам (Malathion) ці артэнам (Orthene).



6. СЛАБАЕ ЦІ РАБОЕ ЛІСЦЕ З БЕЛЫМ ПАВУЦІННЕМ СА ЗВАРОТНАГА БОКУ

Гэтая праблема звязана з тлёй. Насякомыя бываюць зялёнага, карычневага ці чырвонага колеру. Яны існуюць асобнымі групамі ў ніжняй частцы лісця і бутонаў, дзе высмоктваюць сок з расліны. Каб пазбавіцца ад тлі, паспрабуйце распыліць дыязінон (Diazinon) ці малаціён (Malathion).

*Калі вашы ружы не падвяргаліся ніводнаму з пералічаных захворванняў, але ўсё ж выглядаюць нездарова, звярніце ўвагу на тое, чым вы ўгнойваеце іх. Ружам патрэбна ўгнаенне.*

# ДОГЛЯД МАЛАДЫХ ЯБЛЫНЬ

**Мерапрыемствы па доглядзе, у прынцыпе, стандартныя. Гэта паліванне, правядзенне падкормак, прафілактычныя апрацоўкі супраць хвароб і шкоднікаў.**

ПАДКОРМКІ

У першы год робяць падкормкі азотнымі ўгнаеннямі: адну каранёвую ранняй вясной, дзве пазакаранёвыя — у маі і дзве пазакаранёвыя — у чэрвені. Азотныя падкормкі патрэбны для таго, каб дрэва хутчэй адужэла і пайшло ў актыўны рост.

Для каранёвай падкормкі трэба развесці ў 10 літрах вады 2 сталовыя лыжкі мачавіны. Норма раствору на адно маладое дрэва — 15 літраў (3 вядры на 2 дрэўцы).

Пазакаранёвыя падкормкі лепш за ўсё зрабіць растворам вадкіх угнаенняў. На 10 літраў вады — 1 сталовую лыжку. Правесці апырскванне з разліку 2 літры на 1 маладую яблыньку.

У наступныя гады для яблынь, якія яшчэ не пачалі пладаносіць, акрамя пералічаных падкормак, варта правесці яшчэ адну каранёвую падкормку ў верасні. У гэты час расліне вельмі патрэбен калій і фосфар, таму для гэтай падкормкі трэба ўзяць 2 сталовыя лыжкі любога фосфарна-калійнага ўгнаення, развесці ў 10 літрах вады і паліць з разліку 2—3 вядры на 1 дрэва, у залежнасці ад яго ўзросту.

Пры каранёвых падкормках трэба ўносіць угнаенні не пад самы ствол (штамб) маладога дрэўца, а адступіўшы ад яго 60 сантыметраў. Паліванне растворам трэба правесці раўнамерна вакол дрэва, вытрымліваючы гэты радыус ад стволіка.

УТРЫМАННЕ ГЛЕБЫ

На ўчастку з маладымі яблынямі глеба павінна быць умерана ўвільготненай. У выпадку выпадзення вялікай колькасці дажджоў трэба правесці рыхленне, для забеспячэння паветрам каранёвай сістэмы дрэва. Яшчэ мэтазгодна ўзяць ломік і зрабіць ім праколы вакол яблыні на глыбіню 30—40 сантыметраў. Праколы робяць на ўзроўні праекцыі канцоў бакавых галінак. У выпадку адсутнасці ў маладога дрэва бакавых адгалінаванняў праколы робяць на адлегласці 0,6 метра ад штамба.

Глебу пад яблынямі вельмі добра рыхліць віламі, праколваючы яе на ўсю глыбіню рожкаў. Вілы пры гэтым нельга паварочваць у той ці іншы бок, інакш можна парваць тонкія карэньчыкі.

У гарачае надвор'е можна паліваць яблынькі метадам дажджавання, у вячэрні час, каб добра прамыць дрэўца. Такі душ спрыяе развіццю кроны і чысціць галінкі і лісце ад шкоднікаў. У сонечны гарачы дзень паліваць яблыні нельга, бо гэта можа выклікаць апёкі. Норма палівання на адзін раз для яблынь адно-двухгадовага ўзросту складае 20—30 літраў на 1 дрэва. Частата паліву наўпрост залежыць ад надвор'я. Калі горача, то паліў праводзяць 1—2 разы на тыдзень.

■ Экслібрыс «Звязды»

# КУПАЛА: ГІСТОРЫЯ ПОЗІРКУ

